ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 43 (5049) 1 лістапада 2019 г. ISSN 0024-4686

16+

Пабачыць гісторыю стар. 4

Чалавек пяці эпох стар. 5

Драматургія голасу стар. 15

Ад стэпаў да пушчы

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК

Работа туркменскага мастака Авездурды Тараева.

Усходнія культуры заўсёды ўражваюць. Іншыя тэрытарыяльныя і гістарычныя ўмовы развіцця часта робяць далёкія народы для нас людзьмі з іншага сусвету. Але пагадзіцеся: наладжванне сувязяў з гэтымі сусветамі значна ўзбагачае светаўспрыманне, за кошт чаго дапамагае лепш разабрацца ў сабе!

Туркменская традыцыйная культура адрозніваецца ад беларускай: яркія нацыянальныя строі са шматлікімі ўпрыгожваннямі, мудрагелістыя танцавальныя кампазіцыі, мяккая, крыху шыпячая мова, адметная музыка. Іншымі словамі — усходні каларыт. Але зразумець адно аднаго не так ужо і складана, бо мова пачуццяў універсальная для ўсіх светаў.

17—18 кастрычніка прайшлі Дні культуры Туркменістана ў Беларусі. Іх урачыстае адкрыццё адбылося ў галоўнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Працяг на стар. 7

ISSN 0024-4686

акцэнты тыдня

Прыярытэты. Узровень беларуска-казахстанскіх адносін у поўнай меры адпавядае стратэгічным інтарэсам дзвюх краін, адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас перамоў з Прэзідэнтам Казахстана Касым-Жамартам Такаевым. «Гэта вынік карпатлівай шматгадовай работы, які дае магчымасць будаваць сур'ёзныя планы на будучыню», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Мінскам і Нур-Султанам напрацаваны станоўчы досвед узаемадзеяння на ўсіх узроўнях, а ступень даверу такая, што краіны адкрыта абмяркоўваюць любыя пытанні, рэзюмаваў Прэзідэнт.

Форум. Рэгіянальным СМІ варта павялічыць долю аналітычных матэрыялаў, у тым ліку па вострасацыяльнай і палітычнай праблематыцы, адзначыў першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Павел Лёгкі на форуме «Выбары-2019: роля рэгіянальных СМІ ў фарміраванні грамадскай думкі па пытаннях выбарчай кампаніі», інфармуе БелТА. Форум, арганізаваны ФПБ пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі, праходзіў у штаб-кватэры Нацыянальнага прафцэнтра і сабраў каля 150 журналістаў. Рэгіянальным СМІ не хапае як палітычнай аналітыкі, так і аналітычных матэрыялаў на спартыўную, культурную тэматыкі. «Людзей усё больш цікавіць у вашым кантэнце тое, што можна назваць эксклюзівам, аналітыкай, развагамі, каментарамі. Сухое інфармаванне — для гэтага ёсць інтэрнэт», — адзначыў Павел Лёгкі.

Стасункі. У Беларусі праходзяць Дні культуры Егіпта. Паводле Міністэрства культуры, такая дамоўленасць дасягнута ў мэтах выканання комплекснай праграмы (дарожнай карты) развіцця супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Егіптам на 2018—2019 гады. У 2005 годзе адбыліся Дні культуры Егіпта ў Беларусі, а ў 2007 і 2008 гадах — Дні культуры Беларусі ў Егіпце. Гэтым разам афіцыйную дэлегацыю гасцей узначальвае старшыня Акадэміі мастацтваў Егіпта доктар Ашраф Закі. Падчас Дзён культуры сваю творчасць дэманструюць артысты фальклорнай трупы «Ісмаілія». Урачыстае адкрыццё Дзён адбылося ў Белдзяржфілармоніі. Канцэрты праходзяць у Мінску і Бабруйску.

Праект. Выстаўку «Захавальнікі памяці: музеі і калекцыянеры» прапануе Нацыянальны гістарычны музей. Першая, гістарычная, частка экспазіцыі знаёміць з гісторыяй самога феномена калекцыянавання ў Беларусі ад збору Радзівілаў XVI стагоддзя да нашых дзён, а таксама з прыватнымі калекцыямі, што паступілі ў розны час у зборы дзяржаўных музеяў і сталі часткай музейнага фонду Беларусі або паслужылі фундаментам для стварэння музеяў. Да ўвагі наведвальнікаў — прадметы з былой калекцыі Паскевічаў, якія сёння захоўвае Нацыянальны гістарычны музей, артэфакты, сабраныя заснавальнікамі царкоўных гісторыка-археалагічных музеяў Магілёва і Віцебска, помнікі з былога Беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні.

Купалаўскі. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы з аншлагам прадставіў у Гродзенскім абласным драматычным тэатры спектаклі «Рэвізор» і «Паўлінка». У абодвух спектаклях ролі выконвала народная артыстка Беларусі Зоя Белахвосцік, якая 26 кастрычніка адзначыла свой юбілей, распавялі ў тэатры. Генеральны дырэктар тэатра Павел Латушка і фатограф Аляксандр Ласмінскі прэзентавалі таксама выстаўку знакамітага фатографа з Гродна Пятра Шумава. У пачатку XX стагоддзя ён эмігрыраваў у Парыж, дзе стварыў цудоўныя партрэты вядомых паэтаў, кампазітараў, пісьменнікаў, мастакоў, палітыкаў.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Прысвячэнне Радзіме

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры запрашае 5 лістапада на адкрыццё фотавыстаўкі Уладзіслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой» і прэзентацыю зборніка паэзіі і прозы сучасных беларускіх аўтараў «Мая Радзіма» — кніжнай навінкі гэтага года. Мерапрыемствы аб'яднаны тэмай любові да роднай зямлі, да нашых вытокаў.

Кніга «Мая Радзіма» — працяг вялікага творчага праекта, які ўжо чатыры гады ладзяць члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах (укладальнік і аўтар) і Уладзіслаў Цыдзік (фотамастак).

У разнастайнае па жанрах выданне ўвайшлі вершы, апавяданні, эсэ і нарысы 26 аўтараў. Гэаграфія апетых мясцін шырокая: Давыд-Гарадок Георгія Марчука, Зэльва Уладзіміра Мазго, Полацк Навума Гальпяровіча, Казловічы, што на Случчыне, Алеся Марціновіча і інш.

Кніга шчодра ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі прыроды, людзей, помнікаў гісторыі і культуры, прадметаў побыту. Фатаграфіі Уладзіслава Цыдзіка і Яўгена Пясецкага не толькі дапаўняюць змест зборніка, але і паказваюць прыгажосць і багацце нашай Радзімы.

Удзел у імпрэзе возьмуць аўтары зборніка, вядомыя дзеячы, артысты, прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда».

Міра ІЎКОВІЧ

Паэтычны лістапад

На сталічных пляцоўках ладзіліся літаратурныя імпрэзы з удзелам пісьменнікаў Мінскага гарадскога аддзялення СПБ. Паэт Леанід Багдановіч прадставіў сваю творчасць у літаратурнай гасцёўні «Аўтограф». У межах сустрэчы прайшла прэзентацыя беларускага нумара часопіса № 9 «Александръ» за 2019 год (Расія), аўтарам якога быў і Леанід Уладзіміравіч.

Па ініцыятыве Мінскага гарадскога аддзялення СПБ і адміністрацыі СШ № 173 у гэтай навучальнай установе ўрачыста адкрылі «Літаратурную гасцёўню». Ганаровы госць імпрэзы — старшыня МГА СПБ Міхась Пазнякоў.

«Беларуская хатка» публічнай бібліятэкі № 7 імя Якуба Коласа вітала творчы дэсант маладых аўтараў: Кацярыну Роўду, Мар'ю Енікаву, Лізавету Дашко. Госці за кубкам гарбаты чыталі вершы, адказалі на шматлікія пытанні.

А 15-я дзіцячая бібліятэка ў мікрараёне Малінаўка гасцінна адчыніла дзверы для студыйцаў «Малінаўскіх галасоў». Творчыя заданні, практыкаванні, азы вершаскладання, «школа юнага крытыка» — невялікая частка таго, чым цікавяцца юныя літаратары. Для старэйшай аўдыторыі ладзілася сустрэча з публіцыстам і краязнаўцам Аляксандрам Плавінскім, прымеркаваная да Года малой радзімы.

Ганна СТАРАДУБ

супольнасць

Слова як мост

Арганізатар Фестывалю славянскай паэзіі ў Варшаве Алесь Наўроцкі ўручае беларуска-польскую анталогію Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча Уладзіміру Чушаву.

У Польшчы прайшоў XII Міжнародны фестываль славянскай паэзіі. У Варшаве, па запрашэнні арганізатара Алеся Наўроцкага, сабраліся паэты з розных краін.

За фестывалем славянскай паэзіі замацавалася назва «Масты». Гэтыя створаныя Алесем Наўроцкім нябачныя збудаванні паспрыялі ўзаемапранікненню славянскіх культур, іх узбагачэнню. Сведчанне таму — доўгатэрміновае супрацоўніцтва паміж гродзенскімі і польскімі літаратарамі. Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Кебіч лічыць, што дзякуючы больш грунтоўнаму знаёмству з польскай літаратурай паглыбіўся досвед беларускіх творцаў, а праз перакладчыцкую дзейнасць палепшылася іх майстэрства.

Выдадзеная ў 2018 годзе анталогія «Масты», складзеная з вершаў 12 гродзенскіх паэтаў у перакладзе на польскую мову і 12 польскіх аўтараў у перакладзе на беларускую, стала падзеяй у літаратурным жыцці абедзвюх краін. Сёлета вопыт выдання пад адной вокладкай паэтычнага двухмоўя прадоўжыўся падрыхтоўкай гэткай жа анталогіі з удзелам польскіх паэтаў і паэтаў Міншчыны: Святланы Быкавай, Марыі Кобец, Людмілы Круглік, Уладзіміра Цануніна, Таццяны Цвіркі, Вольгі Савасцюк, Ганны Міклашэвіч, аўтара гэтых радкоў.

Да гэтага праекта спрычыніліся зноў жа і паэты Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Людміла Кебіч, Дзмітрый Радзівончык, Ганна Скаражынская-Савіцкая, Аліна Сабуць, Мар'ян Дукса, Руслан Казлоўскі парупіліся зрабіць пераклады на беларускую мову вершаў польскіх паэтаў. Анталогію ўпрыгожылі малюнкі беларускага акварэліста Вячаслава Паўлаўца. Удзельнікі выдання ўдзячны польскай перакладчыцы Міры Лукшы, якая прыклала шмат намаганняў для развіцця нашых літаратур.

Анталогіі такога кшталту ствараліся з удзелам польскіх паэтаў і творцаў Італіі, Латвіі. Нашы паэты папоўнілі гэтую міжнародную паэтычную скарбонку двойчы. Прэзентацыя беларуска-польскай анталогіі «Масты» адбылася ў Варшаве падчас міжнароднага фэсту, удзел у якім бралі Марыя Кобец з Беларусі, Алена Карнеева з Расіі, Сюзана Куглерава і Ондрэй Каламар са Славакіі, Яцэк Яшчык з Нідэрландаў, Іаана Свэнсан са Швецыі, паэты з Італіі, польскія творцы.

Адкрываючы прэзентацыю, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча Уладзімір Чушаў зазначыў, што фестываль паэзіі, збіраючы пад сваім дахам таленты з розных куткоў свету, спрыяе іх яднанню і з'яўляецца магутным інструментам умацавання міжчалавечых і міжнацыянальных адносін. Яго падтрымаў былы калега-дыпламат Аляксандр Авяр'янаў, які цяпер актыўна займаецца паэтычнай творчасцю.

Прэзентацыю беларуска-польскай анталогіі ў Варшаве дапоўніла дэманстрацыя фотавыстаўкі Уладзіслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой». Анталогіі «Масты» з запрашэннем цяпер ужо польскіх літаратараў мяркуецца прадставіць у Мінску.

Алена СТЭЛЬМАХ

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

4 лістапада *— на «Свята дзіцячай кніжкі» з удзелам Вольгі Шпакевіч у бібліятэку № 7 імя Я. Коласа (11.00).*

4 лістапада *— на сустрэчу з Ганнай Кашубай у дзіцячы дом № 5 (11.30).*

5 лістапада *— на сустрэчу з Алай Чорнай у СШ № 126 (11.00).*

6 лістапада *— на сустрэчу з Андрэем Скарынкіным у бібліятэку № 7 імя Я. Коласа (11.00).*

10 лістапада *— на гала-канцэрт духоўнай паэзіі і песні ў Палац культуры прафсаюзаў (13.00).*

10 лістапада *— на свята духоўнай паэзіі і песні ва Усіхсвяцкі прыход (14.00).*

11 лістапада *— у Школу юнага паэта пры гарадскім аддзяленні СПБ (каб. 309) (14.30).*

11 лістапада *— на «Свята дзіцячай кнігі» (13.30) і на пасяджэнне студыі «Малінаўскія галасы» (16.00) у дзіцячую бібліятэку № 15.*

12 лістапада *— на сустрэчу з Міхасём Башлаковым у гімназію № 23 (12.00).*

14 лістапада *— на сустрэчу з Нінай Галіноўскай у гімназію № 23 (12.00).*

15 лістапада *— на сустрэчу з паэтэсай з Санкт-Пецярбурга Кацярынай Палянскай у Дом кнігі «Светач» (17.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

4 лістапада *— на адкрыццё кнігарні «Кніжная зорка» ў Віцебску з удзелам Тамары Красновай-Гусачэнкі і Ірыны Радзіхоўскай (11.00).*

8 лістапада *— на сустрэчу з Галінай і Сяргеем Трафімавымі «Рознакаляровая палітра жывой прыроды» ў Аршанскую бібліятэку імя У. Караткевіча (11.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

5 лістапада *— на заняткі-брыфінг «Літаратурныя ўніверсітэты» з удзелам Людмілы Кебіч, Ліны Багданавай, Пятра Сямінскага і Дзмітрыя Радзівончыка ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (11.30).*

5 лістапада *— на вечарыну Дзмітрыя Радзівончыка «Грунтавыя воды» ў бібліятэку № 10 г. Гродна (17.00).*

8 лістапада *— на чарговае пасяджэнне Слонімскага раённага літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса на тэму «Літаратурная школа» ў Доммайстэрню Надзеі Салейкі (г. Слонім) (17.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

2 лістапада *— на сустрэчу Алены Кісель з удзельнікамі заключнага этапу алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная супольнасць» у гасцініцу «Турыст» (14.30).*

7 лістапада *— на сустрэчу з Міхаілам Смаляровым «Откровение» ў МДУ імя А. А. Куляшова (аўд. 353) (16.00).*

8 лістапада *— на тэлемост паміж членамі СПБ Вольгай Бяловай, Аленай Кісель, Вольгай Малянковай-Куляшовай і паэтамі г. Новасібірска ў Магілёўскую дзіцячую бібліятэку № 2 (12.00).*

9 лістапада *— на сустрэчу з Марынай Сліўко «Старонка родная мая» ў санаторый «Дубравенка» (Магілёўскі раён, ст. Палыкавіцкія хутары) (17.00).*

Мінскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

8 лістапада *— на літаратурна-музычную імпрэзу «Пад небам восені бы ў храме» з удзелам пісьменнікаў аддзялення СПБ у літаратурны клуб «Рэзананс» пры Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна (17.00).*

12 лістапада *— на прэзентацыю дзіцячай кнігі Святланы Быкавай «Сонечны зайчык» у Нясвіжскую цэнтральную раённую бібліятэку (12.00).*

не абмініце

Цацкі па-венгерску

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры гэтымі днямі запрашае наведаць часовую літаратурна-мастацкую экспазіцыю «Вершы ў малюнках». Гэта сумесны праект з Пасольствам Венгрыі ў Беларусі, паведамілі ў музеі. Выстаўка будзе доўжыцца да 9 лістапада.

Чым захапіць дапытлівага чытача дзіцячай кнігі, вырашаюць пісьменнік і мастак. Як гэта адбываецца ў сучаснай Венгрыі, распавядае выстаўка. Аснову экспазіцыі «Вершы ў малюнках» складаюць ілюстрацыі да дзіцячых вершаў, выдадзеных у сучаснай Венгрыі.

Наведвальнікі могуць убачыць увасабленні казачных герояў мультфільмаў праз керамічныя вырабы, прадастаўленыя Мастацкім таварыскім аб'яднаннем імя Ласло Месароша. Экспанаты са знакамітай калекцыі «Цацкі ў горадзе» Музея Обуда, аднаго з найстарэйшых краязнаўчых музеяў Будапешта, даюць магчымасць пабачыць венгерскія цацкі XX стагоддзя.

Дапаўняюць экспазіцыю кніжныя выданні з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры — пераклады венгерскіх народных казак і літаратурных твораў на беларускую і рускую мовы.

Большасць экспанатаў выстаўляецца ў Мінску ўпершыню, падкрэслілі ў музеі. Пасольства Венгрыі ў Беларусі ў межах выстаўкі праводзіць конкурс на найлепшыя дзіцячыя малюнкі паводле ўбачанай экспазіцыі.

Іна ЛАЗАРАВА

праекты

ЗНАЁМАЯ НЕЗНАЁМАЯ ГРУЗІЯ

Фотавыстаўка «Грузія — краіна старажытнай культуры» адкрылася ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Праект рэалізаваны пры падтрымцы Пасольства Грузіі ў Рэспубліцы Беларусь.

У экспазіцыі, якая складаецца з пяці раздзелаў — архітэктура, турызм, помнікі пісьмовай культуры, рарытэты музейных калекцый, сімвалы веры, — прадстаўлена 100 фотаработ, прысвечаных шматвяковай культуры і гісторыі Грузіі.

Архітэктурныя пейзажы дэманструюць найбольш адметныя тварэнні грузінскіх дойлідаў. Турыстычная Грузія адлюстравана ў фотаздымках найбольш папулярных курортаў.

Звяртаюць увагу помнікі пісьмовай культуры з Грузінскага нацыянальнага цэнтра рукапісаў у Тбілісі. Гэта старонкі з паэмы «Віцязь у тыгровай шкуры» грузінскага дзяржаўнага дзеяча і паэта XII ст. Шата Руставелі, геаграфічная карта Вахушці Баграціёна сярэдзіны XVIII ст., розныя літургічныя работы.

Грузінскі нацыянальны музей прадстаўлены фатаграфіямі ўнікальных экспанатаў: ювелірныя ўпрыгажэнні, статуэткі, кубкі, рытуальныя прадметы, створаныя ў I—II тыс. да н. э. з каштоўных металаў і камянёў. Самы вядомы артэфакт — залатая статуэтка льва ў латах III тыс. да н. э., знойдзеная ў мінулым стагоддзі ў кургане непадалёк ад Тбілісі. Фігурка стала адной з найважнейшых знаходак для ўсёй Грузіі, таму што з'яўляецца выключным аб'ектам па тэхналогіі і мастацкім выкананні. Наведаць экспазіцыю можна да 17 лістапада.

Міра ІЎКОВІЧ

Хвалі запрашаюць!

КАНАЛ "КУЛЬТУРА" БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ

На канале «Культура» штодня выходзяць літаратурна-мастацкія праграмы.

З панядзелка да пятніцы ў 14:05, 23:00 у «Літаратурнай анталогіі» артыстка Ліка Пташук чытае аповесць Васіля Быкава «Знак бяды». У 11:00 і 20:30 праграма «Радыёбібліятэка» прапануе паэму Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш, альбо Апошні наезд на Літве» ў прачытанні Ільі Кургана. З 7 лістапада ў «Радыёбібліятэцы» — твор Людмілы Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла». Урывак з дакументальнай аповесці Лідзіі Арабей пра славутую паэтэсу Алаізу Пашкевіч («Цётку») слухайце ў суботу, 2 лістапада, у 21:30. У нядзелю ў гэты час можна будзе паслухаць апавяданне Віктара Праўдзіна «Прычэп» і навелу Аляксандра Яшына «Частую рабінамі».

2 лістапада, у суботу, у 09:05 і 15:45, — сумесная з выдавецтвам «Мастацкая літаратура» праграма «Кнігалюбу». У ёй прымаюць удзел рэдактары, мастакі, аўтары, якія раскрываюць для слухачоў «кухню» выдавецкай працы.

У другім новым публіцыстычным праекце «Запрашаем у кнігарню» 3 лістапада будзе гаворка пра пераклады Марыі Кобец, зборнік паэзіі і прозы «Мая радзіма», навінкі айчынных выдавецтваў. Слухайце ў нядзелю ў 09:05 і 15:45.

Вершы Віктара Шніпа прагучаць у суботу і нядзелю, 2 і 3 лістапада, у праграме «Паэзія XXI стагоддзя». Яе можна паслухаць у 09:45 і 16:00. Гэта новы праект канала «Культура», дзе 15 хвілін аддадзены творчасці сучасных паэтаў. Аўтар і вядучы праграмы — паэт Навум Гальпяровіч.

Аматарам вершаванай спадчыны канал «Культура» ў выхадныя дні ў 07:15 прапануе праграму «Паэтычная раніца». 2 і 3 лістапада прагучаць радыёкампазіцыі па творчасці Янкі Журбы і Валерыя Маракова. 9 і 10 лістапада слухайце вершы Анатоля Грачанікава і Генадзя Бураўкіна з фондаў Беларускага радыё.

За публіцыстыку

Наталля Саветная, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, удастоена ўзнагароды на X Міжнародным славянскім літаратурным форуме «Залаты Віцязь», заключны этап якога праходзіў у расійскім Пяцігорску. Урачыстасць была прысвечана 220-годдзю з дня нараджэння Аляксандра Пушкіна і 205-годдзю з дня нараджэння Міхаіла Лермантава.

На прызавыя «Віцязі» прэтэндавалі 302 творы з Масквы, Санкт-Пецярбурга, іншых рэгіёнаў Расіі і замежных краін. Падчас цырымоніі закрыцця былі ўручаны ўзнагароды лаўрэатам форуму. Статуэтку «Сярэбраны Віцязь» з рук прэзідэнта форуму Мікалая Бурляева атрымала Наталля Саветная за кнігу «Угадывай любящим сердцем» у намінацыі «Публіцыстыка». Пяць раздзелаў кнігі аб'ядноўвае ідэя адкрыць для чалавека значнасць пакаяння. Здольнасць Наталлі Саветнай з'яднаць у адно цэлае простае і высокае дазваляе чытачу атрымаць асалоду ад чытання.

Наталія КАСЦЮЧЭНКА

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5 гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу з далейшым заключэннем кантракта ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

1	кафедра гісторыі музыкі і музыкальнай беларусістыкі	– загадчык кафедры (1,0 шт. адз.) – дацэнт (1,0 шт.адз.)
2	кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін	– дацэнт (1,0 шт. адз.)

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ выказваюць шчырыя спачуванні паэту Міколу Шабовічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ Серафімы Уладзіміраўны.

ЛіМ КАЛЯНДАР

2 лістапада — 150 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Стаброўскага (1869—1968), археолага, краязнаўца.

2 лістапада — 110 гадоў з дня нараджэння Максіма Лужаніна (сапр. Аляксандр Каратай) (1909—2001), паэта, празаіка, кінадраматурга, перакладчыка, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, заслужанага дзеяча культуры Польшчы.

3 лістапада — 105 гадоў з дня нараджэння Паўла Левановіча (1914—1943), празаіка, публіцыста.

4 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Леанарда Ліхтаровіча (1919—1967), беларускага мастака-афарміцеля, графіка.

4 лістапада — 75 гадоў з дня нараджэння Юрыя Палякова (1944—2004), беларускага скульптара.

5 лістапада — 115 гадоў з дня нараджэння Надзеі Хадасевіч-Лежэ (1904—1983), французскай мастачкі беларускага паходжання.

6 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Гарулёва (1919—1980), празаіка, драматурга, паэта, перакладчыка, заслужанага работніка культуры БССР.

10 лістапада — 270 гадоў з дня нараджэння Мацея Радзівіла (1749—1800), дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, кампазітара, драматурга.

10 лістапада — 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Ананькі (1929—1986), скульптара.

11 лістапада — 305 гадоў з дня нараджэння Марціна Матушэвіча (1714—1773), пісьменніка-мемуарыста, перакладчыка.

11 лістапада — 50 гадоў з часу стварэння (1969) заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр».

12 лістапада — 140 гадоў з дня нараджэння Баляслава Бальзукевіча (1879—1935), скульптара.

12 лістапада — 115 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Іванова (1904—1955), кампазітара.

14 лістапада — 110 гадоў таму (1909) пачала выдавацца штодзённая грамадска-палітычная газета «Минский голос». Выдавалася да 30.11.1918 г.

люстэрка тыдня

Прэзентацыю міжнароднага дабрачыннага кінафестывалю «Прамяністы анёл» з дэманстрацыяй фільмаў-лаўрэатаў прапанавалі гэтымі днямі ў Доме Масквы ў Мінску. Паказы адбыліся падчас Дзён духоўнай культуры Расіі ў Беларусі, паведаміла БелТА. Да ўвагі гледачоў — фільмы «Мяжа» рэжысёра Дзмітрыя Цюрына, «Бліжэй, чым здаецца» Наталлі Беляўскенэ, «Тры дні Клавы Грачовай» Яна Грыгалюнаса, «Сола» Канстанціна Абаева, «Скарб» Ірыны Волкавай, «Вяртанне Савы» Наталлі Федчанкі, «Лісты лялькі» Наталлі Грофпель, «Пяць хвілін да мора» Наталлі Мірзаян, «Жылі-былі» Эдуарда Пары. Дні духоўнай культуры Расіі ў замежных краінах — адзін з прыярытэтных кірункаў у міжнароднай дзейнасці Міністэрства культуры Расіі.

Стагадовы юбілей мастацкага аб'яднання УНОВИС («Сцвярджальнікі новага мастацтва») адзначаць у Беларусі выстаўкамі і міжнароднай канферэнцыяй, паведаміла БелТА. Аб'яднанне было створана вучнямі і выкладчыкамі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, дзе спачатку ў Марка Шагала, а потым у Эля Лісіцкага і Казіміра Малевіча вучыўся Лазар Хідэкель, які нарадзіўся ў Віцебску. Ён з'яўляецца адным з заснавальнікаў УНОВИСа, у 16 гадоў узначаліў архітэктурную майстэрню аб'яднання (1920). У сярэдзіне лютага ў Віцебску плануецца міжнародная канферэнцыя, а ў Мінску — выстаўка работ Лазара Хідэкеля. На працягу года будуць праходзіць розныя творчыя праекты. А нядаўна ў іспанскай Марбельі арганізавалі выстаўку малюнкаў дзяцей з Беларусі, ЗША, Польшчы і Іспаніі. Педагогі расказвалі навучэнцам пра Шагала, Малевіча, Віцебскую мастацкую школу і прапаноўвалі ім штосьці напісаць на гэтую тэму.

Белдзяржуніверсітэт у два разы палепшыў сваю пазіцыю ў амерыканскім рэйтынгу *Best Global Universities*. На гэты момант БДУ — адзіная беларуская ВНУ, уключаная ў гэту базу, паведамілі ў прэс-службе ўніверсітэта. Сярод ВНУ краін СНД Белдзяржуніверсітэт займае другое месца, уступаючы толькі МДУ імя М. В. Ламаносава. А ўзначалілі рэйтынг Гарвардскі ўніверсітэт, Масачусецкі інстытут тэхналогій і Стэнфардскі ўніверсітэт. Усяго ацэньваецца 1,5 тыс. універсітэтаў з 81 краіны, што складае каля 5 працэнтаў ад усіх дзеючых у свеце 30 тыс. ВНУ.

Калектыў «Сатырыкона» 24 кастрычніка ў дзень 80-годдзя тэатра, якое супадае з днём нараджэння заснавальніка тэатра Аркадзя Райкіна, сабраўся каля яго помніка на Новадзявочых могілках. Як паведамляе РІА «Новости», каб успомніць гісторыю тэатра, ускласці кветкі легендарнаму артысту, пабыць разам. Увечары адбыўся спектакль «Дон Жуан», дзе ў галоўных ролях выступілі Цімафей Трыбунцаў і Канстанцін Райкін. Гісторыя тэатра пачалася ў 1939 годзе, тады ён зваўся Тэатрам мініяцюр. А «Сатырыконам» стаў у 1987 годзе.

Рэжысёр новага фільма пра Джэймса Бонда «Не час паміраць» Кэры Фукунага заявіў, што толькі ён ведае, чым скончыцца баявік, паведамляе РІА «Новости» са спасылкай на *Mirror*. Фукунага зняў тры альтэрнатыўныя фіналы, каб пазбегнуць уцечкі інфармацыі аб дэталях сюжэта. Таму нават выканаўца галоўнай ролі Дэніэл Крэйг не ведае, які фінальны эпізод выбярэ рэжысёр. СМІ ўжо пісалі пра тое, што Бонд можа быць забіты ў апошнім фільме, пасля чаго агентам 007 стане жанчына (Лашана Лінч). Выхад карціны запланаваны на красавік.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

Культурны сінтэз праз захаванне памяці

У Мінску прадставілі ўнікальную рэканструкцыю акта Люблінскай уніі

Наша краіна сёлета адзначае шмат юбілеяў, якія звязаныя з самымі рознымі падзеямі гісторыі. Адзін з іх — 450-годдзе з моманту падпісання Люблінскай уніі паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім Княствам Літоўскім. З гэтай нагоды ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адкрылася выстаўка «Вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі», арганізаваная Польскім інстытутам у Мінску.

На выстаўцы прадстаўлена гістарычная рэканструкцыя акта Люблінскай уніі са збору Музея гісторыі Польшчы. Арыгінал акта Люблінскай уніі знаходзіцца ў калекцыі пергаментных дакументаў Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве. Тэкст акта быў падрыхтаваны ў двух экзэмплярах для кожнага з бакоў — Кароны і Княства. Польскі асобнік, падпісаны дэпутатамі Кароны, прызначаны для Вялікага Княства Літоўскага, не захаваўся да нашых часоў. Існуючы акт уніі — гэта асобнік Вялікага Княства Літоўскага. Ён зацверджаны пячаткамі сенатараў і дэпутатаў ВКЛ.

Арыгінал акта уніі захаваўся ў адносна добрым стане, аднак ён недаступны шырокай грамадскасці — гэта абумоўлена далікатнасцю артэфакта, спецыфічнымі патрабаваннямі да ўмоў яго экспанавання. Таму было прынята рашэнне аб стварэнні рэстаўрацыйнай копіі, якая паўтарае матэрыялы і тэхналогію

вырабу арыгінала. Работа над стварэннем гістарычнай рэканструкцыі дакумента вялася каля двух гадоў. Экспазіцыю выстаўкі дапаўняюць гістарычныя хронікі, а таксама статут ВКЛ 1588 года з фондаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа. Акунуцца ў адну з ключавых гістарычных падзей Усходняй Еўропы наведвальнікам дапамагае і рэпрадукцыя карціны Яна Матэйкі 1869 года. На палатне аўтар адлюстраваў фактычна ўсю палітычную эліту таго часу ў зале Люблінскага замка ў момант падпісання акта.

Люблінская унія.

— Паміж намі вельмі шмат агульнага. І трэба заўважыць, што Польшча і Беларусь аднолькава адказна ставяцца да захавання гістарычнай спадчыны, — адзначыў на адкрыцці праекта Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Артур Міхальскі. — Рэч Паспалітая аб'ядноўвала розныя культуры і нацыі, таму мы разам сёння клапоцімся пра тое, каб захавалася не толькі памяць, але і нашы сувязі. Таму гэты праект магу назваць удалым прыкладам культурнага супрацоўніцтва. Заўважна, наколькі Нацыянальны гістарычны музей Беларусі зацікаўлены ў развіцці і даследаванні гісторыі. Плённая праца ў такім кірунку будзе спрыяць далейшаму развіццю культуры Беларусі.

Арганізатары з беларускага боку ўпэўнены, што калі разглядаць Люблінскую унію з пункту гледжання працэсу, то можна знайсці шмат як станоўчых, так і адмоўных момантаў. Але ж важна адно: нашчадкі не губляюць магчымасці разглядаць і згадваць гісторыю не як спаборніцтва, а як культурны сінтэз і памяць.

Дарэчы, Люблінская унія у 2018 годзе была ўнесена ў Сусветны рэестр ЮНЕСКА «Памяць свету» па захаванні сусветнай дакументальнай спадчыны. Дакумент быў прадстаўлены як сумесны запіс пяці краін — Польшчы, Літвы, Украіны, Беларусі і Латвіі.

— Выстаўка, якую мы адкрылі, выклікае цікавасць з пункту гледжання мастацкага, гістарычнага і адукацыйнага працэсу, — адзначыў на ўрачыстым адкрыцці дырэктар Нацыяльннага гістарычнага музея Беларусі Павел Сапоцька. — Арганізоўваўся праект з пачуццём гонару і адказнасці за нашу гісторыю: 450-годдзе з дня падпісання Люблінскай уніі — знакавая падзея. Нашым супрацоўнікам было цікава працаваць над праектам і з практычнага, і з навуковага боку. Калісьці я меў магчымасць дакрануцца да галоўнага аб'екта выстаўкі падчас сваіх вандровак і тады падумаў, што яго абавязкова павінны ўбачыць у роднай Беларусі. Паразмаўляў з навукоўцамі, рэстаўратарамі, якія працуюць у Музеі гісторыі Польшчы, і зразумеў, наколькі складана было зрабіць копію акта. Такі праект нам цікавы і тым, што нашы школы рэстаўрацыі могуць абменьвацца досведам, што вельмі каштоўна.

Зараз Нацыянальны гістарычны музей Беларусі і музей гісторыі Польшчы знаходзяцца ў аднолькавых умовах — праектавання новых будынкаў для экспазіцый. Гэты момант, безумоўна, спрыяе карыснаму супрацоўніцтву. Сёлета таксама спаўняецца 25 гадоў дзейнасці Польскага інстытута ў Мінску, што сведчыць пра плённую працу ўстановы на тэрыторыі нашай краіны. Выстаўка «Вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі» адкрыла шэраг святочных культурных мерапрыемстваў, якія Польскі інстытут плануе правесці ў Мінску.

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара.

Якая яна, кніга будучыні?

Больш чым пяць стагоддзяў таму Іаган Гутэнберг падарыў свету тыпаграфскую літару і друкарскі станок. Якраз тады ў кнігавыданні і распаўсюджанні інфармацыі адбылася рэвалюцыя… Што мае месца ў выдавецкай справе сёння? Як развіваецца выдавецкая дзейнасць у нашай краіне, на якіх пастулатах трымаецца? На гэтыя ды іншыя тэмы разважалі ўдзельнікі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Выдавецкая справа ў Рэспубліцы Беларусь: гісторыя, сучасны стан, праблемы і перспектывы», прысвечанай 75-годдзю факультэта журналістыкі і 50-годдзю кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч падчас адкрыцця пленарнага пасяджэння зазначыў: «Новыя эканамічныя ўмовы вызначылі і новы статус выдавецкіх прадпрыемстваў. Змянілася парадыгма кнігавыдання, якое развіваецца ў зусім новай тэхналагічнай сітуацыі». Для савецкага перыяду была характэрная колькасная мадэль, пры якой галоўным лічыўся валавы выпуск друкаванай прадукцыі. Цяпер кнігавыдаўцы найперш глядзяць, каб кнігі адпавядалі запытам мэтавай аўдыторыі, патрабаванням навукі і культуры, грамадства.

Падчас дыскусіі, якая адбылася ў межах круглага стала экспертаў, абмеркавалі шэраг надзённых пытанняў. Некаторыя з іх тычыліся месца кнігі ў сучасным свеце, інтэрактыўнай кнігі з выхадам у альтэрнатыўную рэальнасць. Выступоўцы адзначалі, што новыя інфармацыйныя тэхналогіі змяняюць падыходы да канструявання і выдання кнігі: яна становіцца больш разнастайнай у параўнанні з тым, якой была раней. Асабліва актуальны гэты досвед пры падрыхтоўцы падручнікаў. Шмат якія вучэбныя дапаможнікі выходзяць з дадаткам у выглядзе дыскаў, з QR-кодамі, з прымяненнем тэхналогій дапоўненай рэальнасці, што стала ўжо частай з'явай. З гістарычнымі помнікамі пісьменства можна азнаёміцца праз алічбоўванне, што забяспечвае захаванасць іх унікальнасці. Ствараюцца базы даных з дакладнай навігацыяй у іх. Аптымальныя шляхі пошуку інфармацыі забяспечваюць імгненнае знаходжанне матэрыялаў і іх фрагментаў. Такія формы адкрываюць новыя магчымасці ў падачы матэрыялу і яго хуткае засваенне. Укараненне адпаведных новаўвядзенняў спрыяе нараджэнню новага ўспрымання і мыслення... І гэта мяняе грамадства, пакаленне, мяняюцца здольнасці чалавека — на што неаднаразова звярталі ўвагу выступоўцы.

Між тым існуе і шэраг праблем з выкарыстаннем інтэрнэт-рэсурсаў. У падручніках недапушчальна даваць спасылкі, напрыклад, на сеціўныя ролікі, таму што кантэнт іх не кантралюецца. Хаця для школьніка было б вельмі зручна: пачытаць пра пэўны аб'ект і адразу ж убачыць яго ў дзеянні. Магчыма, стварэнне патрэбнага рэсурсу — справа будучыні.

Другая група пытанняў мела мэтай прасачыць пераемнасць традыцый у арганізацыі сучаснага выдавецкага працэсу. «Сённяшняя кніга і работа выдавецтва — гэта інтэграваны працэс, стварэнне 3D-мадэлі, відэаінфармацыі, ілюстрацыйных радоў, з дапамогай якіх вучань можа глыбей зразумець тыя ці іншыя з'явы. Каб адпавядаць сучасным патрабаванням чытачоў, выдаўцы асвойваюць раней ім не ўласцівыя функцыі: выкарыстоўваюць паслугі гукарэжысёраў, гукааператараў, мантажораў, вучацца здымаць відэа, знаходзяць прафесійных акцёраў», — дзялілася дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вольга Ваніна.

Навукоўцы адзначалі: хаця змены, якія адбыліся ў кнігавыданні, закранулі ўсе аспекты працы прадпрыемства, галоўнае засталося нязменным. Гэта — увага да аўтара, яго таленту і ўмення данесці сваю думку да чытацкай аўдыторыі. Падкрэслівалі высокую сацыяльную місію кнігі ў сучасным глабалізаваным свеце, а таксама тое, што трансфармацыя выдавецкіх прадпрыемстваў дае большыя магчымасці ў стварэнні эфектыўных кніжных праектаў і прадстаўленні іх на міжнародным узроўні. Удзельнікі перакананы: друкаваная кніга будзе змяняцца, але не знікне ні з кнігарняў, ні з адукацыйнага працэсу. Больш

Фота з сайта www.journ.bsu.by

за тое, яна захавае свой уплыў на чытача. «Фізічныя кнігі сёння выглядаюць як фізічныя кнігі мінулага стагоддзя, сучасныя лічбавыя — выглядаюць і функцыянуюць амаль гэтак жа, як 10 гадоў таму. Мы шукаем кнігу будучыні не там! Кнігі, якія трымаем у руках сёння, і ёсць кнігі будучыні», — як падсумаванне, прагучала ў адным з дакладаў.

У панэльных дыскусіях уздымалі пытанні падрыхтоўкі шматпрофільнага спецыяліста для выдавецкай галіны, узаемаўплыву журналістыкі і выдавецкай дзейнасці. У пасяджэннях панэльных дыскусій узялі ўдзел больш чым 40 даследчыкаў і спецыялістаў-практыкаў і з Беларусі, і з замежжа.

Падчас работы канферэнцыі яе ўдзельнікам прапанавалі выстаўку «Лепшыя з лепшых: кнігі — пераможцы Нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі"», інтэрактыўную экскурсію «Гісторыя выдавецкай справы: з рэдкага фонду Фундаментальнай бібліятэкі БДУ», творчую сустрэчу з Уладзімірам Ліпскім. Сярод замежных удзельнікаў быў дацэнт кафедры журналістыкі Палтаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя У. Г. Караленкі, кандыдат навук па сацыяльных камунікацыях Глеб Кудрашоў. Ён прадставіў свой праект — прэзентаваў акадэмічную студыю «Дыпламатыя кнігі: "Энеіда" Катлярэўскага ў перакладзе Аркадзя Куляшова».

Яна БУДОВІЧ

«ТРЫВОЖУСЯ ЗА БЕЛЫ СВЕТ»

Пяць эпох лёсу Мікалая Мішчанчука

Ён быў аднолькава моцны як педагог, літаратуразнавец, крытык і паэт. Мікалай Мішчанчук зняў шэраг праблемных пытанняў, што тычыліся розных аспектаў вывучэння беларускай літаратуры, быў арыгінальным і ў той жа час пераканаўчым даследчыкам беларускага замежжа, заклаў канцэптуальны грунт для асэнсавання ўзаемасувязей рускай і беларускай літаратур, адзначыўся пастаноўкай актуальных праблем методыкі выкладання літаратуры і літаратуразнаўства. Перад намі асоба няпростага лёсу, чалавек пяці эпох.

Першая эпоха — сталінская. З ёй у Мікалая Іванавіча — самыя вялікія рахункі. Яго дзед працаваў на зямлі. Такіх, як ён, у сталінскія часы ссылалі на Далёкі Усход. За дзедам туды накіраваліся бацькі Мікалая Іванавіча. Таму нарадзіўся ён на прыіску Майск Мазанаўскага раёна Амурскай вобласці. Неўзабаве бацькі пераехалі на станцыю Юхта Свабоднанскага раёна той жа вобласці. Што значыла для яго станцыя Юхта? Сем класаў мясцовай школы, дзе ён быў ва ўсім узорам для аднакласнікаў. Першыя паэтычныя спробы. Пазней Мікалай Іванавіч дзяліўся ўспамінамі: «Вершы я пачаў пісаць з трэцяга класа. Гэта здарылася само сабой. Ніхто мяне не прымушаў, не натхняў. Матуля была непісьменная, бацька загінуў на вайне, айчым малапісьменны. Пагэтаму мой шлях да паэзіі — гэта хутчэй праява цікаўнасці, жаданне павысіць уласную эрудыцыю, выканальнасць, праца над сабой і пошук сябе».

> «*Прафесар Мішчанчук валодаў унікальнай здольнасцю скіраваць студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў на плённую працу. У БрДУ імя А. С. Пушкіна ён стварыў навуковую школу, падрыхтаваў добры дзясятак кандыдатаў філалагічных навук. Яго вучні выдатна даследавалі і даследуюць беларускую літаратуру ў кантэксце сусветнай літаратуры».*

Праз год пасля пачатку хрушчоўскай адлігі Мішчанчукі вярнуліся на Беларусь. Беларускі этап жыцця Мікалая Іванавіча пачаўся ў пасёлку Чырвоны Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Спачатку атрымаў сярэднюю, потым вышэйшую адукацыю ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага. І зноў вучоба толькі на выдатна. Пазней працаваў у школе, пачаў выступаць у друку як паэт.

У брэжнеўскую эпоху Мікалай Мішчанчук вяртаецца ў альма-матар у якасці аспіранта. Пасля заканчэння аспірантуры будзе працаваць тут да 1996 года. Ён прайшоў шлях ад шараговага выкладчыка да намесніка дэкана філалагічнага факультэта. Экспертная супольнасць надзвычай высока ацаніла кандыдацкую дысертацыю Мікалая Іванавіча «Лірыка Я. А. Баратынскага. Папярэднікі і спадчыннікі». Пасля яе бліскучай абароны стаў працаваць над доктарскай. На працягу шасці гадоў узначальваў секцыю беларускай літаратуры пры навуковым савеце Міністэрства народнай адукацыі БССР. Пад яго кіраўніцтвам секцыя працавала вельмі плённа. Заўважнай падзеяй стаў выхад вучэбнага дапаможніка для філалагічных факультэтаў педагагічных інстытутаў «Беларуская літаратура на сучасным этапе». Убачылі свет зборнікі паэзіі Мікалая Мішчанчука «Вернасць» (1979), «Трывожуся за белы свет».

> «*У сваіх даследаваннях Мікалай Іванавіч у многім па-новаму тлумачыў паэзію Яўгеніі Янішчыц, аповесць «Гандлярка і паэт» Івана Шамякіна, творчасць Таісы Бондар, Уладзіслава Хадасевіча, лірыку кахання Петруся Броўкі, вобраз Палесся ў лірыцы Пімена Панчанкі».*

Літаратуразнавец, крытык, паэт, педагог станоўча ўспрыняў надыход гарбачоўскай перабудовы. Мікалай Іванавіч вітаў курс каманды Гарбачова на распрыгонесенасць думкі, зрабіў істотны ўнёсак у вяртанне імён рэпрасіраваных майстроў слова. Пра гэта сведчылі кніга «Настаўніку — пра настаўнікаў: нарысы, рэпартажы з урокаў, эсэ», вучэбны дапаможнік «Беларуская савецкая паэзія 20-х гадоў». Мела сваю логіку прызначэнне Мікалая Мішчанчука загадчыкам кафедры беларускай літаратуры якраз у разгар гарбачоўскай перабудовы. Менавіта на гэтай пасадзе ён сустрэў абвяшчэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Да сярэдзіны 1990-х гг. Мікалай Іванавіч стане доктарам філалагічных навук. Тэма доктарскай дысертацыі сфармулявана наступным чынам: «Жанрава-стылёвыя асаблівасці сучаснай беларускай паэзіі». Базавай манаграфіяй для дысертацыі стала кніга «Ёсць у паэта свой аблог цалінны: жанрава-стылёвая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі». Сапраўдным прарывам у навучальна-метадычным плане стаў вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для старшых класаў агульнаадукацыйных школ «Як жыць — дык жыць для Беларусі...».

Апошнія 16 гадоў жыцця Мікалая Мішчанчука былі звязаны з Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А. С. Пушкіна. Цягам шасці гадоў узначальваў кафедру тэорыі і гісторыі рускай літаратуры, два гады — кафедру беларускага літаратуразнаўства БрДУ імя А. С. Пушкіна. У 1998 г. быў абраны членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. За час працы ў БрДУ выйшла манаграфія «Руская і беларуская літаратуры XIX—XX стст.: жанрава-стылёвы аспект, пытанні ўзаемадзеяння». У суаўтарстве надрукавана хрэстаматыя «Уводзіны ў літаратуразнаўства».

У сваіх даследаваннях Мікалай Іванавіч у многім па-новаму тлумачыў паэзію Яўгеніі Янішчыц, аповесць «Гандлярка і паэт» Івана Шамякіна, творчасць Таісы Бондар, Уладзіслава Хадасевіча, лірыку кахання Петруся Броўкі, вобраз Палесся ў лірыцы Пімена Панчанкі. Прафесар валодаў унікальнай здольнасцю скіраваць студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў на плённую працу. У БрДУ імя А. С. Пушкіна ён стварыў навуковую школу, падрыхтаваў добры дзясятак кандыдатаў філалагічных навук. Яго вучні выдатна даследавалі і даследуюць беларускую літаратуру ў кантэксце сусветнай літаратуры.

Мікалай Іванавіч запомніўся і як крэатыўны лектар, таленавіты кіраўнік семінарскіх заняткаў. Доктар філалагічных навук, прафесар БрДУ імя А. С. Пушкіна Зоя Пятроўна Мельнікава, якая шмат гадоў працавала з Мікалаем Мішчанчуком, згадвае:

«Мікола Іванавіч адразу стаў любімым выкладчыкам студэнтаў, кумірам калег, бо літаральна выпраменьваў дабрыню і зычлівасць, меў сапраўдную беларускую шляхетнасць, нястомнасць у працы з моладдзю. У студэнцкай аўдыторыі ён працаваў заўсёды з натхненнем: не шкадаваў эмоцый, ніколі не быў "сухім акадэмістам", узрушаўся, расчульваўся, а часам і абураўся шчыра, да слёз. Літаратура была яго пакліканнем. Яго лекцыі па беларускай, рускай літаратуры, па спецыяльных дысцыплінах былі запамінальнымі, незвычайнымі; кожны пісьменніцкі лёс, пра які ішла гаворка, ён прапускаў праз уласнае сэрца».

Прыкладна ў гэты час Мікалай Мішчанчук стаў сябрам пісьменніцкай арганізацыі. Вялікі розгалас меў выхад яго кнігі паэзіі «Струна надзеі». Гэта — узор адлюстравання агульначалавечых каштоўнасцей у мастацкай літаратуры. Таму хочацца чытаць і перачытываць наступныя радкі са зборніка:

І сэрца, ласкаю сагрэта,
Успыхне промнем уначы,
Каб на апошнім кіламетры
Жыцця другім дапамагчы.

Калі б тое, пра што гаворыць лірычны герой, стала нормай для любога чалавека, мы жылі б у зусім іншым свеце. Сам Мікалай Іванавіч увасабляў у жыццё агульначалавечыя каштоўнасці як прафесіянал у педагогіцы і навуцы, а таксама — як муж, тата, дзядуля.

Міхаіл СТРАЛЕЦ

землякі

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

ЧАЦВЁРА Ў МАЙСТЭРНІ... І ПА ЖЫЦЦІ

Аднойчы, некалькі гадоў таму, неяк ідучы па вуліцы, здалёк звярнуў увагу на досыць экзатычную постаць, якая ярка выбівалася сярод мінакоў. На чалавеку быў каўбойскі капялюш, яркая куртка, на нагах — туфлі з высокімі абцасамі…

Кідалася ў вочы і шырокая барада. Наблізіўшыся, раптам пазнаў старога знаёмага, наваполацкага мастака Уладзіміра Шапо. Абняліся, загаварылі. Валодзя расказаў, што пераехаў жыць у сталіцу, бліжэй да сыноў. Я ўжо ведаў, што ўсе яго тры сыны — паспяховыя мастакі, удзельнікі многіх прэстыжных выставак. Пагадзіцеся: не часта сустрэнеш такую творчую дынастыю.

У маёй мінскай кватэры ёсць дзве работы прадстаўнікоў гэтай мастакоўскай сям'і — самога Уладзіміра і яго сына Паўла. Гэта падарункі. Калі на акварэлі старэйшага Шапо — выява Сафійскага сабора, то работа Паўла — авангардысцкая кампазіцыя, якая мае патаемны філасофскі сэнс. Увогуле, па творчых манерах і выбары напрамку ў мастацтве усе чацвёра абсалютна розныя. Гэта можна было бачыць і на вялікай выстаўцы, што прайшла летась у галерэі музея гісторыі Мінска.

Уладзімір Дзмітрыевіч прыехаў у Наваполацк пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута. Там хлопец з Браслава спасцігаў таямніцы творчай прафесіі ў такіх выдатных педагогаў і мастакоў, як Фелікс Гумен, Яўген Красоўскі, Іван Сталяроў. У 1970-я ў маладым горадзе склалася цікавае мастакоўскае асяроддзе, і Шапо актыўна ўключыўся ў лік маладых і амбітных творцаў, сярод якіх вылучаліся Віктар Лук'янаў, Леў Аганаў, Уладзімір Пацэвіч, Георгій Танковіч і іншыя.

У 1989 годзе старэйшы Шапо ўступіў у Беларускі саюз мастакоў. Яго творы экспанаваліся на выстаўках у Беларусі, Расіі, Літве, Латвіі, Украіне, Польшчы… Прайшлі персанальныя выстаўкі ў Віцебску, Лондане, Мінску, Грозным. За гады выкладання ў Наваполацкай дзіцячай мастацкай школе Шапо выхаваў нямала таленавітых творцаў. Але самымі выдатнымі яго выхаванцамі аказаліся ўласныя сыны.

Старэйшы з трох братоў Саша — скульптар і графік. Вось як адгукаліся на яго работы спецыялісты: «У Шапо шмат алегорый, сімвалаў, адсылак да іншых твораў... Яны выклікаюць гледача на роздум, на ўдумлівае сузіранне».

Антон працуе ў дэкаратыўным жанры, Павел — жывапісец. Бацька для сыноў не толькі настаўнік, ён сябар, часам строгі і жорсткі, а ў цэлым ласкавы і клапатлівы. Усе мужчыны ў сям'і беражліва і пяшчотна ставяцца да малодшай сястры і, безумоўна, да маці Валодзевых дзяцей і вернай яго спадарожніцы па жыцці. Нягледзячы на знешні эпатаж, а гэта характэрная рыса ўсяго сямейства, у дынастыі Шапо пануюць традыцыйная лагода і сяброўства, узаемная падтрымка.

І яшчэ. Усе яны, нягледзячы на цяперашнюю сталічную прапіску, вельмі прывязаны душой да роднай Полаччыны. Уладзімір Дзмітрыевіч неаднаразова прымаў удзел у распрацоўцы многіх праектаў, скіраваных на рэстаўрацыю і рэканструкцыю гістарычных аб'ектаў старажытнага горада. Ды і сёння ўсё, што адбываецца на малой ра-дзіме, — у сферы інтарэсаў гэтай унікальнай творчай сям'і.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ:

«Подых сонца і пустыні…»

Напярэдадні адкрыцця чарговай кніжнай выстаўкі ў Ашхабадзе, удзел у якой прымае і беларуская дэлегацыя, мы звярнуліся з пытаннямі да міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь, журналіста і пісьменніка Алеся КАРЛЮКЕВІЧА з просьбай адказаць на некалькі пытанняў у сувязі з выстаўкай. Зварот — невыпадковы. У сярэдзіне 1980-х гадоў Алесь Мікалаевіч жыў і працаваў у Туркменістане. А яшчэ неаднаразова наведваў Ашхабад ужо ў новым XXI стагоддзі. Дарэчы, наш суразмоўца — яшчэ і аўтар кнігі «Літаратурнае пабрацімства: Беларусь — Туркменістан».

— Алесь Мікалаевіч, чым так запомніўся Туркменістан, што і сёння пішаце пра туркменскіх пісьменнікаў, расказваеце пра беларуска-туркменскія гістарычныя і літаратурныя сувязі?..

— Трапіў я ў Ашхабад у жніўні 1985 года, калі меў за плячыма ўсяго 21 год. І мне вельмі пашчасціла на сустрэчы з добрымі людзьмі: і ўраджэнцамі Беларусі, якіх было ў Ашхабадзе процьма, і з туркменскімі пісьменнікамі і журналістамі, сяброўства з многімі з іх захаваў да сённяшніх дзён. І неяк так само сабой складвалася, што кожны дзень мне прыносіў нейкія дэталі, факты, пазнакі, якія звязвалі Беларусь з Туркменістанам. Канешне ж, быў і пэўны пошук, да якога падштурхоўвалі падказкі землякоў. Тады ліставаўся з Адамам Мальдзісам, Генадзем Каханоўскім, Анатолем Ярохіным… І ўсе яны ў адзін голас раілі шукаць беларускае, шукаць беларусаў. А з Масквы, пасля з Тбілісі пісаў Мікола Калінковіч, які сам за год да гэтага пакінуў Ашхабад. Ён выдаў у Туркменістане некалькі кніг, здаралася, што прыязджаў у камандзіроўкі, працаваў у мясцовым архіве.

Спакваля збіраўся архіў на тэму «Беларуска-туркменскія літаратурныя сувязі», з'яўляліся ў туркменскіх газетах і часопісах і мае публікацыі на гэтую тэму. Шмат мне дапамагалі такія туркменскія літаратары, як Какалы Бердыеў, Нарклыч

Хаджагельдыеў, Каюм Тангрыкуліеў, Ашыр Назараў, Курбан Чаліеў, Агагельды Аланазараў, Касым Нурбадаў і шмат хто яшчэ.

Калі гаварыць, што засталося ў памяці з таго часу… Дык гэта хутчэй тая цеплыня, якую вылучалі самі туркмены, надзвычай цікавы і сімпатычны народ, прырода Каракумскага краю.

— Ці сочыце вы за развіццём туркменскай літаратуры зараз?

— У мяне ёсць некалькі карэспандэнтаў, з якімі часта лістуюся праз інтэрнэт. Гэта Агагельды Аланазараў, Бягуль Анабаева, Максат Бяшымаў, Атаджан Таган. Да іх звяртаюся з роспытамі, цікаўлюся, што новага з'явілася ў туркменскай паэзіі, прозе. Яны і пра сябе пішуць, і пра сваіх калег расказваюць. Спадарыня Бягуль працуе ў часопісе «Каракум», Максат Бяшымаў — у часопісе «Дунья эдэбіяты» («Сусветная літаратура»). Яны, між іншым, і самі цягнуцца да беларускай літаратуры, перакладаюць творы нашых пісьменнікаў, арганізоўваюць беларускія публікацыі ў туркменскіх газетах і часопісах. Дзякуючы найперш іх намаганням у апошнія гады ў Туркменістане надрукаваны пераклады твораў Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Танка, Алеся Бадака, Юліі Алейчанкі, Алега Ждана, Міколы Мятліцкага…

А з Максатам Бяшымавым мы зараз складаем анталогію туркменскага апавядання. Ён падбірае для мяне падрадкоўнікі найлепшых твораў апошняй чвэрці стагоддзя. А я паступова перакладаю. Ужо ў «Маладосці», «Полымі», «Бярозцы», альманаху «Далягляды» надрукаваны апавяданні Атаджана Тагана, Камека Куліева, Джумы Худайгулыева, Какамурата Атаева.

— Мо з часам і анталогія туркменскага апавядання выйдзе ў Беларусі?

— Так. Быў жа некалі — у 1980 годзе — па-беларуску выдадзены зборнік туркменскага апавядання «Аксамітная ружа». Пад адной вокладкай знайшлося месца творам Ата Каўшутава, Бекі Сейтакава, Нарымана Джумаева, Ташлі Курбанава, Сеітніяза Атаева, Агултэч Аразбердыевай, Курбандурды Курбансахатава, Хаджанепеса Мяляева… Мне пашчасціла: некаторых са згаданых пісьменнікаў я ведаў асабіста.

— А ўвогуле, як вы лічыце, што з туркменскай літаратуры варта было б прадставіць па-беларуску асобнымі кнігамі?

— Некаторы час назад падзеяй стала выданне ў Мінску аднатомніка Вялікага Фрагі. Перакладчыкам большасці твораў выступіў наш вядомы паэт Казімір Камейша. А Віктар Гардзей пераклаў дзіцячую кнігу Агагельды Аланазарава. Выйшла на беларускай мове і кніжачка вершаў і апавяданняў Касыма Нурбадава. Канечне ж, мне хутчэй хацелася б пабачыць кнігу прозы Максата Бяшымава. У туркменскай літаратуры заўсёды вылучалася паэзія. Так павялося з даўніх часін. Ад Махтумкулі, Сеідзі, Зелілі… Аўтарытэт туркменскай паэзіі надала праца геніяльных творцаў XX стагоддзя Керыма Курбанняпесава, Курбаназара Эзізава, паэтаў, якія і зараз, на шчасце, працуюць у літаратуры, — Набаткулі Рэджэпава, Атамурада Атабаева, Газель Шагулыевай (Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў адзначыў яе званнем Героя Туркменістана), Агагельды Аланазарава (ён выдатна працуе і ў прозе). Вось чые кнігі варта выдаць у перакладзе на беларускую мову. І па меры сваіх сціплых сіл, магчымасцей я, несумненна, буду спрыяць гэтаму.

— Што ж, цэлая праграма па стварэнні партрэта туркменскай літаратуры ў Беларусі!..

— Чаму б і не?!. Мастацкі свет туркменскага слова варты прадстаўлення ў еўрапейскай краіне. Думаю, што такая беларуская бібліятэка Туркменістана паступова сфарміруецца. У дадатак, зразумела, да тых кніг, што былі выдадзены ў ранейшыя дзесяцігоддзі, — Ягмура Піркуліева, Нуры Байрамава, Курбана Чаліева, Берды Кербабаева, Анна Кавусава, той самай «Аксамітавай ружы»…

— Вядома, па сённяшнім часе з выданнем перакладных кніг усё нашмат складаней…

— Не болей, чым само жыццё з'яўляецца таксама складаным. Важную ролю ў развіцці літаратурных сувязяў, перакладчыцкіх публікацый адыгрываюць асабістыя стасункі. І развіццю беларуска-туркменскіх літаратурных сувязяў, спадзяюся, паспрыяе і тое, што ў Ашхабадзе часта бываюць беларускія пісьменнікі. Толькі ў апошнія гады — Юлія Алейчанка, Алесь Бадак, Алена Масла… А ў Мінск прыязджалі Ісмаіл Таган, Агагельды Аланазараў, Абягуль Анабаева, Газель Шугалыева, Чэмен Анабердыева… Жывыя ўражанні, магчымасць усё асэнсаваць, убачыць на свае вочы, без чужога пераказу, — гэта ці не самы лепшы падмурак для развіцця, пашырэння літаратурнай дружбы?!.

Гутарыў Максім ВЕЯНІС

Цягне лес да гор

Шмат гадоў, дзесяцігоддзяў і нават ужо стагоддзяў злучаны паміж сабою дзве культуры, дзве літаратуры — беларуская і туркменская. Здавалася б, адлегласць паміж Беларуссю і Туркменістанам немалая — тысячы кіламетраў, мовы настолькі далёкія адна ад адной, што і вузельчыкаў ніякіх агульных няма зусім, але вось цягне лес да гор, азёры — да пустыні, пяску. Цягнуцца адзін да аднаго розныя менталітэты, розныя па рэлігіі людзі цягнуцца адзін да аднаго. І шмат якія факты — яркае таму пацвярджэнне. Згадаем хаця б некаторыя з іх…

Давайце спярша зазірнём у сярэдзіну XIX стагоддзя. Ураджэнец сучаснага Мядзельскага раёна на Міншчыне Аляксандр Ходзька, падарожнік па Туркменістане, запісаў паэтычныя тэксты туркменскага паэта Махтумкулі і надрукаваў іх у Англіі. Гэтая падзея стала пачаткам еўрапейскай славы класіка туркменскай літаратуры. Ураджэнец мядзельскіх Крывічоў расійскі дыпламат Аляксандр Ходзька таксама запісвае і туркменскі эпас «Кёр-аглы», вершы Кемінэ. Затым публікуе ў сваіх перакладах на англійскай мове. Праца нашага суайчынніка адкрывае Еўропе туркменскі фальклор, імёны невядомых дагэтуль пісьменнікаў, знаёміць з багатым на гісторыю народам. Паводле перакладу Ходзькі рыхтуюцца нямецкае, рускае і французскае выданні «Кёраглы». Перакладчыцай на французскую мову выступае Жорж Санд. Вось які цікавы ланцужок цягнецца: туркмен Махтумкулі — беларус Аляксандр Ходзька — француженка Жорж Санд…

У XX стагоддзі да перакладаў Махтумкулі на беларускую мову звярталіся народны паэт Беларусі Максім Танк, Алесь Звонак, Уладзімір Караткевіч і іншыя вядомыя беларускія літаратары. У Мінску пабачыла свет асобная кніга паэзіі Махтумкулі «Салавей шукае ружу». Верш «Лёс туркмена» ў перакладзе У. Караткевіча на беларускую мову апублікаваны і ў кнізе аднаго верша Махтумкулі на мовах народаў свету, выдадзенай у Ашхабадзе. Вартая ўвагі мініяцюрная кніга пачатку 1990-х гг. аўтарам гэтых радкоў была перададзена ў Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны. А зусім нядаўна вялікі том твораў Махтумкулі выйшаў у Мінску да юбілею класіка туркменскай паэзіі. Перакладчык — выдатны беларускі паэт Казімір Камейша. Вялікую арганізатарскую працу па рэалізацыі ў Мінску гэтага праекта правёў паэт і перакладчык Ганад Чарказян. Пра гэта шмат пісалі ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы.

Пачатак знаёмства чытачоў Туркменістана з творчасцю беларускіх пісьменнікаў пакладзены публікацыяй апавядання Якуба Коласа на рускай мове ў газеце Закаспійскай вобласці «Асхабад». Першыя кнігі народных песняроў Беларусі Купалы і

Коласа пабачылі свет на туркменскай мове ў 1941 г. Перакладчык — А. Ніязаў. Шырока былі адзначаны стагадовыя юбілеі Якуба Коласа і Янкі Купалы ў Туркменістане ў 1982 г. З'явіўся цэлы шэраг новых перакладаў, былі апублікаваныя артыкулы пра класікаў беларускай літаратуры ў газетах і часопісах «Совет эдебияты», «Совет Туркменистаны», «Эдебият ве сунгат». Вялікую працу па прапагандзе творчасці Янкі Купалы вёў вядомы туркменскі публіцыст, літаратурны крытык Какалы Бердыеў, які ўзначальваў у 1980-я гады рэдакцыю газеты «Эдебият ве сунгат». Невыпадкова К. Бердыеву прысвечаны асобны артыкул у беларускай энцыклапедыі «Янка Купала». Памятаю, з якім душэўным узрушэннем, з якім сардэчным хваляваннем трымаў у руках таўшчэзны зялёны том з артыкулам пра яго Какалы Бердыеў. Урачыстасць моманту надаваў і той факт, што кнігу ў Ашхабад даслаў сам Максім Танк.

Пачатак сувязям Беларусі і Туркменістана ў галіне выяўленчага мастацтва паклаў прафесійны туркменскі мастак Назар Іамудскі — сын поўнага Георгіеўскага кавалера, камандзіра ўланскага палка, героя Рускатурэцкай вайны, удзельніка штурму Шыпкі Анамухамеда Іамудскага. Разам з працамі Н. Іамудскага «Будаўніцтва Закаспійскай чыгункі», «У гарах Капетдага» ў гісторыі выяўленчага мастацтва засталіся карціны «Зіма ў Беларусі», «Белавежская пушча». Беларускі скульптар Віктар Папоў (1923— 1981) з'яўляецца аўтарам помніка Махтумкулі ў Ашхабадзе (1970) і шэрагу іншых скульптурных работ у Туркменістане (Ашхабад, Небіт-Даг). Ашхабадскі і небіт-дагскі Ленін у скульптуры — працы беларуса Віктара Папова. У Беларусі ваяваў (пад Віцебскам) народны мастак СССР і Туркменістана, Герой Сацыялістычнай Працы Ізат Клычаў.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

З кнігі «Літаратурнае пабрацімства: Беларусь — Туркменістан»

Ад стэпаў да пушчы

Святочны канцэрт распачаўся вітальнымі прамовамі міністра культуры Беларусі Юрыя Бондара і намесніка міністра культуры Туркменістана Нурсахета Шырымава. «На працягу апошніх гадоў беларуска-туркменскія адносіны актывізаваліся ва ўсіх сферах. Культура, як вядома, найлепш спрыяе наладжванню і ўмацаванню сувязяў паміж людзьмі і народамі. Няма сумненняў у тым, што дні культуры Туркменістана стануць яшчэ адной яркай старонкай у летапісе духоўнага ўзаемаўзбагачэння нацыянальных культур і агульным унёскам ва ўмацаванне сяброўства паміж дзвюма краінамі», — адзначыў Юрый Бондар.

Сярод удзельнікаў канцэрта былі народныя і заслужаныя артысты Туркменістана, і маладыя творцы. Туркменскія майстры мастацтваў выходзілі на сцэну ў традыцыйных строях і спявалі пераважна на сваёй роднай мове, але беларускім слухачам была зразумелая мова музыкі, мова эмоцый, мова любові да роднага краю, якой была прысвечана большасць нумароў. Не абмінулі туркменскія творцы і тэму кахання: некалькі твораў былі выкананыя дуэтамі і быццам ператвораныя з песень у маленькія тэатральныя пастаноўкі. Зноў жа — нават не разумеючы слоў, кожны з прысутных у зале мог лёгка зразумець характар персанажаў і адносін. Асабліва прыемна для беларусаў было пачуць песню «Белавежская пушча» ў выкананні туркменскай спявачкі.

На сцэне ўвесь час панавала музыка. Праз відэарад з туркменскімі краявідамі, традыцыйнымі рамёствамі і абрадамі, якім суправаджаўся кожны выступ, і дзякуючы фальклорнай групе «Докмачылар», якая аздобіла многія песні традыцыйнымі танцамі, туркменская культура раскрылася значна шырэй. Была магчымасць не толькі слухаць музыку, але і ў пэўным сэнсе адчуць абставіны, у якіх яна стваралася, наблізіцца да вытокаў іншай культуры. Гэтаму таксама паслужыла выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прадстаўленая ў фае філармоніі.

Культура — гэта коды, пры дапамозе якіх шыфруюцца звычайныя чалавечыя каштоўнасці, агульныя для ўсіх. Абмен культурнымі здабыткамі — шлях да ўзаемапаразумення. Беларусь і Туркменістан імкліва рухаюцца па ім.

Дар'я СМІРНОВА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

гасцёўня

Алесь БАДАК:

«Важна знайсці перакладчыка, які цябе зразумее»

Паэт і празаік Алесь Бадак шмат гадоў працаваў у літаратурных перыядычных выданнях Беларусі, а з 2015 года ўзначальвае выдавецтва «Мастацкая літаратура». Падчас сваёй працы ён неаднаразова сутыкаўся з туркменскай літаратурай і сочыць за яе развіццём, новымі імёнамі. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» штогод удзельнічае ў міжнародных кніжных выстаўках у Туркменістане, таму і сама краіна паэту вядомая і, як ён прызнаецца, нават натхніла яго на стварэнне ўласных твораў. Таму пра літаратурнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Туркменістанам Алесь Бадак распавядае і з веданнем справы, і з вялікай асабістай зацікаўленасцю:



Рух насустрач

— Актыўнае супрацоўніцтва паміж беларускімі і туркменскімі выдаўцамі і пісьменнікамі развіваецца ўжо на працягу добрых гадоў дзесяці, а то і больш. Гэтаму шмат спрыяюць міжнародныя кніжныя выстаўкі, якія штогод праходзяць і ў нас у Мінску, і ў Ашхабадзе. Раней, пасля таго як не стала Савецкага Саюза і на нейкі час разарваліся ўсе творчыя кантакты паміж рэспублікамі, было так: прыязджаеш у той жа Туркменістан, пачынаеш гаварыць пра беларускую літаратуру ці пытаешся, наколькі туркменскія пісьменнікі ведаюць беларускую літаратуру, ці бачыш выстаўкі, дзе прадстаўлена ў тым ліку беларуская літаратура, і прыходзіш да высновы, што яны ведаюць у асноўным класічную літаратуру або літаратуру васьмідзясятых гадоў, калі яшчэ існаваў Савецкі Саюз і такія сувязі, узаемапераклады былі частай з'явай. І з гэтым, канешне ж, трэба было нешта рабіць, бо вялікі пласт сучаснай літаратуры быў незнаёмы чытачу з блізкага замежжа. Ужо з'явілася некалькі пакаленняў беларускіх пісьменнікаў, сярод якіх былі вельмі цікавыя творцы, вартыя ўвагі і замежнага чытача.

Тады мы пачалі наладжваць больш цесныя кантакты паміж пісьменнікамі, выдаўцамі, паміж літаратурнымі СМІ краін СНД.

У свой час (калі я не памыляюся, гэта быў 2013 год) у Выдавецкім доме «Звязда», тады яшчэ РВУ «Літаратура і мастацтва», з'явілася серыя «Созвучие», якая задала пачатак актыўнаму супрацоўніцтву паміж пісьменнікамі краін блізкага замежжа. У кожным томіку серыі была прадстаўлена адна з літаратур краін СНД і — другая частка кнігі — творы беларускіх пісьменнікаў. Такім чынам беларуская сучасная літаратура трапіла ва ўсе краіны СНД: у бібліятэкі, у міністэрствы культуры, у выдавецтвы. Зразумела, гэта тычыцца і Туркменістана.

З моманту з'яўлення «Созвучия» развіццё супрацоўніцтва з Туркменістанам стала яшчэ больш актыўным. Зроблена вельмі шмат. Выйшлі кнігі сучасных туркменскіх пісьменнікаў. Шмат твораў туркменскіх паэтаў і празаікаў змешчана ў перыядычных выданнях. Я сам працаваў у часопісах «Нёман», «Маладосць» і «Полымя», многае рабілася на маіх вачах. Адначасова дзякуючы гэтым кантактам беларуская літаратура пачала друкавацца ў Туркменістане.

Абмен словамі

— Гэтае супрацоўніцтва кожны год развіваецца. У нас выдаецца альманах «Далягляды» — гэта адроджаны папулярны ў васьмідзясятыя штогоднік. У ім друкуюцца творы замежных аўтараў, як з блізкага, так і з далёкага замежжа. Прынамсі, у «Далягладах»-2019 ёсць творы двух туркменскіх празаікаў — гэта Максат і Атаджан Таган. Асаблівую ўвагу хацеў бы звярнуць на аўтара, які піша пад псеўданімам Максат. Вельмі цікавы, арыгінальны празаік, які, з аднаго боку, працягвае традыцыі класічнай туркменскай літаратуры, а з іншага — у ім адчуваецца еўрапейскі стыль. Гэты празаік яшчэ даволі малады і вельмі таленавіты.

Кожны год, калі мы прыязджаем на кніжную выстаўку ў Туркменістан, абавязкова бяром з сабой айчынныя выданні, дзе прадстаўлена туркменская літаратура. Нашыя туркменскія сябры таксама нас заўсёды радуюць новымі перакладамі беларускай літаратуры. У туркменаў ёсць часопіс «Сусветная літаратура» на туркменскай мове, у ім друкуюцца творы, у тым ліку і беларускіх аўтараў. Можна згадаць газету, назва якой, дарэчы, перакладаецца як «Літаратура і мастацтва», у ёй таксама актыўна прадстаўляецца беларуская літаратура. Сёлета «Мастацкая літаратура» вязе ў Туркменістан, апроч зборніка «Далягляды», яшчэ кнігу «Санеты Янкі Купалы» на мовах свету, дзе таксама прысутнічаюць пераклады на туркменскую мову.

Ва ўспрыманні літаратуры, якая перастворана з іншай мовы і ўвогуле належыць да іншай культуры, вялікую ролю адыгрывае перакладчык. Таму і ў міжнародных літаратурных адносінах справа не толькі ў тым, каб надрукавацца або надрукаваць недзе сваіх калег, але і ў тым, каб знайсці перакладчыка, які цябе зразумее. Вельмі прыемна, што сярод нашых калег у Туркменістане ёсць не толькі таленавітыя аўтары, але і выдатныя перакладчыкі, дзякуючы якім творы беларускіх аўтараў з'яўляюцца ў туркменскай перыёдыцы.

Мы зацікаўленыя ў тым, каб беларуская літаратура была прадстаўлена на туркменскім кніжным рынку не толькі ў якасці публікацый у перыядычных выданнях, але і асобнымі кнігамі — аўтарскімі або анталогіямі, напрыклад, дзіцячай літаратуры. Дзіцячая літаратура самая інтэрнацыяльная. Казкі народаў свету заўсёды запатрабаваныя і дапамагаюць зразумець іншыя культуры. Не так даўно ў Азербайджане выйшла кніга, у якой прадстаўлены дзіцячыя творы беларускіх пісьменнікаў самых розных пакаленняў: ад класікаў да сучаснікаў. І гэтае выданне стала прыкладам таго, якія кнігі могуць быць выдадзены ў іншых краінах, у тым ліку ў Туркменістане.

Літаратура з менталітэтам

— Калі я быў студэнтам, мне, як і многім чытачам, здавалася, што найцікавейшая замежная літаратура тая, якая створаная ў Еўропе: англійская, французская, нямецкая. Маўляў, там багатыя традыцыі, якія аказваюць уплыў на развіццё сусветнай літаратуры, там з'яўляюцца новыя кірункі, нейкія модныя тэндэнцыі. Пазней зразумеў, што ў кожнай краіны ёсць свая арыгінальная літаратура, якая можа быць цікавая ва ўсіх канцах свету. Туркменская літаратура цікавая менавіта сваёй самабытнасцю. Калі пісьменнікі імкнуцца да падабенства з так званымі «раскручанымі» літаратурамі, да нейкіх «модных» з'яў у літаратуры, то праз гэта яны рэдка становяцца шырокавядомымі. Падробка ніколі не ішла на карысць ніводнаму пісьменніку. Можна ўвогуле пра культуру гаварыць, і пра жывапіс, і пра музыку, і пра ўсё на свеце. Заўсёды цэніцца арыгінальнасць і самабытнасць. Тое, што моднае, можа быць папулярным, але гэтая папулярнасць, як правіла, кароткачасовая. А той, хто піша самабытна, займае сваё месца на доўгі час. Сама туркменская літаратура адносіцца да тых з'яў сусветнай культуры, да якіх можна і варта прыглядацца вельмі ўважліва.

У літаратуры Туркменістана шмат філасофіі. У ёй няма гэтай еўрапейскай лёгкасці, арыентаванай на чытача-практыка, у якога заўсёды не хапае часу. Тут больш запаволены рытм, а запаволенасць вымагае роздуму. І менавіта гэта мы знаходзім у туркменскай паэзіі і прозе — філасофію, жыццёвую, чалавечую мудрасць. І таму, хто хоча бліжэй пазнаёміцца з іншым народам, іншай культурай, таму, хто шукае ў літаратуры самабытнасці, было б цікава сустрэцца з туркменскай літаратурай, у тым ліку на старонках нашых выданняў «Мастацкай літаратуры» і Выдавецкага дома «Звязда».

Дар'я СМІРНОВА

«Да мора хазарскага хваль...»

МАХТУМКУЛІ

Доля туркмена

З Джэйхуна да мора хазарскага* хваль*
Вятрыска спякотны над краем
туркмена.
Уцеха вачэй маіх, ружы
крышталь, —
Ад водаў у горных рачулках туркмена.

Ёсць праўда ў душы, прахалода ў садах.
Для нараў і маяў* — нябёсы за дах.*
Буяе рэйхан у гарачых пясках.*
Аздобілі кветкі пустыню туркмена.

Адзенне на перы — вясёлка між хмар,*
І амбраю цешыцца гожанькі твар.
Народ, апантаны здзяйсненнямі мар,
Узвёў і мястэчкі, і сёлы туркмена.

Нашчадак герояў. Душа Гёраглы.*
Туркменскаму льву не патрэбна хвалы.
Хай прыйдзе навала захопнікаў злых —
Заступіцца леў — абаронца туркмена.

Плямёны адзінаю мудрай сям'ёй
Збіраюць для тою абрус з цеплынёй.*
Калі ж аб'яднаюцца моцай сваёй —
Расплавіцца можа граніт у туркмена.

Тады, як на горы ён, конны, зірне,
Рубінам становяцца горы, бы ў сне.
Не воды, а мёд між палеткаў імкне,
І грэбля не спыніць намераў туркмена.

Вайна не захопіць знянацку яго,
Не прыме прыгнёту чужынскіх сцягоў.
І ружы, бы гурыі райскіх лугоў,
Не звянуць ані пад наглядам туркмена.

Плямёны ў сябрыне жывуць што ні год,
Шануюць па звычаі дзедзічаў род.
Калі ж на змаганне паўстане народ —
Святло перамогі чакае туркмена.

Мы здатныя горы сабой рустуліць,
Куды б нас дарогі-шляхі ні вялі.
Давеку — сцвярджае вам Махтумкулі —
Жыць будзе і мова, і песня туркмена!

З туркменскай.
Пераклад Пятра Жаўняровіча.

Джэйхун — Амудар'я. Хазарскае мора — Каспій. Нар — аднагорбы вярблюд. Мая — самка нара. Рэйхан — базілік. Перы — фантастычныя міфалагічныя істоты ў выглядзе прыгожых дзяўчат. Гёраглы — персанаж аднайменнага гераічнага народнага эпасу. Той — пышная бяседа з пачастункам, песнямі, танцамі.

СЕЙДЗІ

Маладзіцы

Не варта смяяцца са старасці вам,
Нас лёгка пакрыўдзіць, мае маладзіцы.
Хвалой пра сябе адгукнуся я сам,
Таму, што прыйшоў я сюды, маладзіцы.

І я быў нядаўна яшчэ малайцом.
Я лёгка ўпраўляўся з упартым канём.
На бітвы джыгітаў вадзіў — і разгром
Чакаў нашых ворагаў там, маладзіцы.

Яшчэ не пазбаўлены лёгкай хады.
І постаць маю не сагнулі гады.
Ад жару жадання растануць ільды,
Хаця сівізна ў барадзе, маладзіцы.

Напасці трываў і не падаў я ніц,
Нямала ў каханні спазнаў навальніц.
Дажыў да сівых валасоў, але кпіць,
Смяяцца не варта вам з іх, маладзіцы.

З чужымі і блізкімі я сябраваў
І сілу сваю, колькі ёсць, аддаваў.
Я добрую славу па свеце збіраў.
Салодка былое згадаць, маладзіцы.

Я знаў асалоду у справах зямных,
Я ладзіў застоллі, толк ведаў у іх,
Ды бачыў пакуты красуняў маіх
І ў смутку прыцьмеў назаўжды,
маладзіцы.

Сейдзі вас дагэтуль шукае цяпер,
Стары закаханы, жабрак ён цяпер,
Хай сэрца яго папялішча цяпер,
Кахайце хоць часам яго, маладзіцы!

З туркменскай.
Пераклад Людмілы Хейдаравай.

КЕМІНЭ

Туркменка

Твой твар беласнежны, а кучараў сіла
Наладзіць з вятрыскам адчайны двубой,
Табе неспакоем спаліць уласціва
Зямлю разам з небам, спажыць, як напой.

Не след закаханаму крочыць падманам.
Я смелы, аб будучым думаць не стану.
Ідзеш — я высокім захоплены станам.
Ідзеш — я палаю шалёным агнём.

І сродкаў няма ў знахароў самых смелых.
Ад яду, што ты дасылаеш на стрэлах.
Тры поўныя, тонкія,
чорныя, белыя —*
Асвечаны разам яе пекнатой.

12 прыкмет жаночай прыгажосці

Спытаю — адкуль ты? Адказ для паэта…
А мо дачка свету —
бясцэнны скарб гэты?
Радзімкю вабіш — то шчасця прыкмета,
Сваім пацалункам мой смутак
спатоль.

Твой раб, асмяяны сябрамі тваімі,
Стаю я ўначы за дзвярыма тваімі.
Прасолены словамі крута тваімі,
Ды зрэзаны вострым тваім языком.

Казаў Кемінэ: наймагутнаю сілай,
Нажамі павек маё сэрца ты ўскрыла
І ў вугаль падпалены ператварыла…
Сукенкаю барвіцца цела тваё!

З туркменскай. Пераклад Міколы Адама.

Агагельды АЛАНАЗАРАЎ

***

Па стэпе так вольна конь белы гуляе,
Бушуе вясна ў яркіх фарбах
шматкветна.
Зноў дожджык з любоўю траву паліває,
І дзень дагарае амаль непрыкметна.
А вецер здзіўляе пяшчотным дыханнем,
Пустыня здаецца наўсцяж
светлалікай.
І свет напаўняецца лёгкім адхланнем,
І дзіўныя мары лунаюць шматзыка.

Бывае, што часам я рады без меры,
Што продкі змаглі тут калісь
пасяліцца.
Наўрад ці хто знойдзе такога
туркмена,
Хто мог бы Радзімаю не ганарыцца.

Конь белы падобны на мару народа,
Пустыня сваёй прыгажосцю здзіўляе.
Пасецца конь там, дзе ўладарыць
прырода
І дзе Гёраглы ўсіх здалёку вітае.

Памяці Нурмырада Сарыханава

*Дэлак**е** ці Дэл**а**ке —*
Сумненні па сёння мае…
Як малдаўскую вёску
Завуць — я не знаю.
Парадніўся я з ёй,
Хоць ніколі не бачыў яе.
Для мяне яна быццам бы
Рана скразная.
Там малдаўскі народ
Свае песні прыгожа пяе
І платы абвіваюць
Густыя кусты вінаграду.
А тады? А тады
Над сялом грукаталі баі,
Па фашыстах страляў,
Трапна біў кулямёт Нурмырата.
Смела ўстаў Нурмырат,
Ды быў куляй варожай прашыт.
Ён упаў у чарот,
Нам пакінуўшы мужныя мары.
І, здалося, Шукур —
Нурмыратам апеты бахшы —
Узяў туркменскі дутар
І маркотна па струнах ударыў.

З туркменскай.
Пераклад Міколы Шабовіча.

Ата АТАДЖАНАЎ

***

Я б з вершаў стварыў цэлы свет…
Я б з вершаў стварыў цэлы свет,
І неба, і сонца, і зоры.
Я б з вершаў стварыў цэлы свет,
Дзе сэрцы не ведаюць гора.

Туды запрасіў бы гасцей,
Каб разам пазбыцца трывогаў.
Каб разам туліцца часцей
Душою да слова жывога.

І марыць, і зорку сваю
Шукаць ад цямна да світання.
І берагу, і ручаю
Штоpанку казаць: «Прывітанне».

Я б з вершаў стварыў цэлы свет,
Каб холаду людзі не зналі.
Я б з вершаў стварыў цэлы свет,
Дзе з радасцю лёсы з'ядналі б.

Хай свет гэты пояць дажджы,
Хай хвалі пяшчотныя песцяць.
Хай кожны каменьчык дрыжыць –
На ласку адказвае песняй.

Свой шлях
У цянётах дарог
Няхай адшукае вандроўнік.
І з песняй узнімецца рог,
Што сябар вясёлы напоўніць.

Я б з вершаў стварыў цэлы свет,
Якога нікому не скрасці.
Я б з вершаў стварыў цэлы свет,
Свет, поўны бязмежнага шчасця.

З туркменскай.
Пераклад Таццяны Сівец.

Ісмаіл ТАГАН

***

Я закахаюся ў цябе —
і розум сыдзе ад мяне.
Срабрысты, пераліўны смех
якое сэрца не кране?
Як цяжка паміж спраў і з'яў,
пакут і мітусні людзей
Сустрэць падобную табе,
а пакахаць — яшчэ цяжэй.

Я закахаюся ў цябе, як россып зор
над галовой
Сінечу дзённую нябёс
накрые коўдраю сваёй.
Хай нас раздзеляць масы вод,
няхай бясконцы акіян —
Між намі мост, трывалы мост
са сваіх вей збудую я.

Як з любымі сваімі ў сад ідуць сябры
мае гурмой,
Я толькі думаю аб тым,
што мог бы так ісці з табой,
Твой позірк выпаліць мяне,
нібы пажар — сухі быльнёг,
Адно апошняю слязой скачуся я
да тваіх ног.

Жыццё, спыніся! Пачакай,
спаткаўшыся з такой красой!
Усе вятры й патокі з гор міжволі
цягнуцца за ёй.
...Сышла — і раз за разам зноў
празрысты, зыбкі сілуэт
У трапяткім паветры
я малюю дымам цыгарэт.

З туркменскай.
Пераклад Наталлі Кучмель.

Безвыходнасць

Гэта так: яшчэ ў сэрцы кахання
агмень не патух
І мяне журавы не пакінулі
ў бездані скрух.
Сагграваю я дом свой бязмежнай
надзеяй дабра —
І, магчыма, што розум зноў вернецца
ў мару пяра.

Яшчэ веры ў сябе не парваныя ніткі
суздром,
Часам мерка мая — гэта крок
або пядзя да стром.
Мне здавалася: шчасце бы казка
ў юдолі жыцця,
Распавесці якую ў натоўпе —
ёсць дзеі працяг.

Але ўсё ж, але ўсё ж, у няведанні
цяжка гібець,
А навошта народжаны мы, як
спазнаць нам сябе?
І чужое нам шчасце, пакуты заўжды ў
сваяках,
І жыццё — каму ісціна, некаму —
хабар не ў страх.
А надзею сілкуюць пяшчотныя
мроі штодзень,
Нібы плынь раўчука ды пагрозныя
скалы падзей.
Аднак, бачачы ўсё, што стварае
згрызоты душы,
Чалавек захліпаецца ў плачы
між немай цішы.

З туркменскай.
Пераклад Пятра Жаўняровіча.

Да поўні

Твайго вяртання ўночы прычакаў,
Сачыў твой след у небе, поўным зор,
Ды смутак усё роўна не знікаў —
Я адчуваў маўклівы твой дакор.

Імкнуўся сум запаланіць прасцяг,
Але надзея ў глыбіні жыла:
Яна трымала нада мной свой сцяг,
Па сонных вулках за сабой вяла.

Тваю пакуту мне не зразумець:
Дарэмна патрапляю ва ўнісон
Трымценню; за табой мне не паспець,
Мой дух закуты ў беспрабудны сон.

Адзіная надзея — палымнець
У вогнішчы кахання, сум суняць.
У апантаным танцы, поўня, мне
Наканавана ісціну спазнаць.

Прасцяг для вуснаў, для вачэй, для душ,
О Поўня! Ты — князёўна Царства Мрой.
Цябе прашу: ускалыхні, узруш
Мой сон, каб я прачнуўся, твой герой.
У прыгаршчах нябёс, праз час, праз лёс,
Праз сны, праз кругаверці і віры
Цябе Ўсявышні да мяне прынёс,
Каб я кахаў, змагаўся і тварыў!

З туркменскай.
Пераклад Янкі Лайкова.

Горы

Зямля — матуля, горы — яе грудзі.
Па схілах — вадаспадаў малако.
У хованкі гуляюць ветрагуды,
Блукаючы ў расселінах вякоў.

Тут жах таму, хто сэрца не ачысціў.
Вятры-гарэзы гладзяць валасы,
Калі з душой анёла, урачыста
Хмялееш сярод велічнай красы.

Хто правіць вамі? Дух сівых стагоддзяў?
Ці, можа, зграі чорных груганоў?
Я паланёны вашай сілай-згодай,
Ах, горы, горы, мары маіх сноў!

Зноў разнатраўе вершаліны будзіць,
Аблокаў вата прыпадае ніц.
Зямля — матуля, горы — яе грудзі,
Вясну частуюць малаком крыніц.

З туркменскай.
Пераклад Валерыя Кухарчука.

Сейран АТУЗАЎ

BONJOUR!

Апавяданне

Валасы яе сёння каштанавыя. Калі яна ўздымае руку, прыгажосць рознакаляровых каменьчыкаў на бранзалеце вабіць зрок. Пэўна, яны яшчэ і звіняць, але, стомлены ад звыклых гукаў, я ўспомню іх як-небудзь іншым разам. Колер яе вачэй, яе броваў, іх спалучэнне, магчыма, я апішу як-небудзь пазней.

Убачыўшы выцягнутую і прыўзнятую руку, кіроўца рэзка спыніў сваё бірузовае аўто. Айнязік спакойна прамовіла:

— У Парыж. Дом *Aucun* у квартале Inconnu. Пасля трэба будзе аб'ехаць яшчэ некалькі пунктаў.

— Ведаеце дарогу?

— Нам падкажуць. За кожны прыпынак — дадатковая плата.

Кіроўца ўзрадаваўся:

— Сядайце!

Святлафор загарэўся чырвоным, аўто затармазіла. Айнязік паказала напрамак і дадала:

— Едзем прама!

Праехалі шырокае скрыжаванне. На ўзбочыне стаяў стары з чорнымі валасамі і сівой барадой. У руках ён трымаў шыльду: «Направа». Кіроўца завярнуў. Праехаўшы яшчэ крыху, сустрэлі ўсмешлівую бабулю ў блакітнай хусцінцы, якая таксама трымала ў руках шыльдачку, праўда, ужо з больш падрабязным надпісам: «Праз трынаццаць метраў — налева, затым направа!».

Кіроўца старанна выконваў гэтыя ўсе інструкцыі. Пачаў накрапваць дождж. Яны зразумелі, што трапілі ў Парыж. Вось і знакамітыя Эйфелева вежа, Трыумфальная арка… Паказальнік з надпісам: «Inconnu». Машына намокла, але затое стала чыстай. Сярод паэтычных вулак рамантычнага горада лёгка згубіцца, але адшукаць дом Aucun трэба было абавязкова. Пакуль кіроўца разглядваў дамы па баках, Айнязік сачыла за дарогай:

— Прыехалі. Хадзем са мною, калі хочаш.

— Канешне, хачу. Я ўпершыню ў Парыжы.

Дзяўчына акуратна адчыніла металічныя дзверцы аўто. Крыху паблукаўшы, яны знайшлі дом, амаль нябачны з вуліцы. Айнязік, відаць, гэтыя мясціны былі добра знаёмыя. Кіроўца цікаўна азіраўся вакол. На першым паверсе іх сустрэў стары:

— Bonjour! Ласкава запрашаем! Выпіце гарачай гарбаты. Для цябе, Айнязік, я заварыў з лісцем лаванды і кветкамі шыпшыны, а для Даянча — чорную гарбатку з малаком.

Даянч не здзівіўся. Яму захацелася проста прымасціцца недзе збоку і паглядзець, што будзе далей. А той стары — гэта я.

— Я прыгатаваў канверт. Вось ён, у гэтай шкатулцы. Калі хочаш, распячатай зараз ці пачакай, пакуль усё будзе падрыхтавана.

— Я пачакаю.

— Добра, так надзейней. Але не забудзься спачатку агучыць замову! — сказаў я з усмешкай. Пасля чаго прыўзняўся са свайго месца і адсунуў фіранку. Гэта так, нібыта між іншым.

— Вам, напэўна, хацелася б пачуць замову?

Я прашаптаў магічныя словы на вуха Айнязік, пасля правёў сваіх гасцей да дзвярэй. Застаўшыся на самоце ў цішыні, з усмешкай пачаў піць гарбату.

Калі яны выйшлі на вуліцу, машына ўжо была смарагдавага колеру. Трэба было выпраўляцца да наступнага пункта. Айнязік села на задняе сядзенне. Вочы яе свяціліся, яна была ў захапленні ад аднаго толькі выгляду шкатулкі з чыстага светлага срэбра.

У канцы вулкі стаяла чарнавокая шатэнка і трымала шыльдачку «Направа». Паварота не было, але Даянч усё роўна завярнуў. Там, далей, на пляцоўцы, гарэзіла шумлівая дзятва. Адзін з хлопчыкаў аддзяліўся ад кампаніі. Махаючы рукамі, ён падбег да аўтамабіля і ўручыў кіроўцу паперку, на якой было напісана: «Дзевяноста сем метраў і налева».

У Рыме вечарэла. Аркі Калізея зіхацелі мяккім залацістым святлом. Даянч звярнуўся да чарнабровай Айнязік:

— Куды цяпер?

— Вуліца Desiderio.

— Добра, здаецца, мы ўжо блізка… Так, вунь яна!

— Спыніся, калі ўбачыш надпіс «*Cuore*».

Аднапавярховы дом, пабудаваны з бездакорным густам. Без дворыка, падобны на музей. На парозе іх сустрэла жанчына ў блакітнай вячэрняй сукенцы.

— Benvenuto!

— Добры дзень! Вось, мы прынеслі шкатулку.

Жанчына ў блакітным — гэта я. Запрасіла іх абодвух зайсці.

— Я прагляджу шкатулку, а вы пакуль выпіце кавы.

Яны прыселі. Тым часам я паклала ў шкатулку нейкую рэч. Распячатала канверт і пад вашы цікаўныя позіркі штосьці напісала. Адначасова паспела адказаць на пытанні, якія доўга скрэбліся на сэрцы Айнязік:

— …І тады цябе не стомяць ні выпітая гарбата, ні кнігі, ні колеры тваіх убораў, ні чалавечая псіхалогія. Не думай пра дробязі і не маладушнічай. А ўсё астатняе ўвойдзе ў сваю каляіну.

— Можна мне прыходзіць да вас тады, калі захочацца?

— Канешне, я заўсёды буду тут. І нават калі пайду на шпацыр, ты заўсёды знойдзеш мяне ў гэтым доме, — сказала я і працягнула ёй шкатулку, пасля доўга махала ім услед.

Калі Айнязік азірнулася апошні раз, я намалявала ў паветры адну фігурку. Айнязік усё зразумела, як і я. Гэта было маё новае заклінанне. Не, нават не новае, а дапоўненае.

Яны селі ў машыну землянога колеру, якой кіраваў Даянч. Айнязік у дадатак да ранейшай шкатулкі займела яшчэ адну, меншую.

Неўзабаве перад імі з'явілася кавярня, у якой месцілася некалькі столікаў. За кожным сядзелі па два-тры чалавекі. Калі машына пад'ехала, яны ўсе разам паказалі налева. Даянч павярнуў.

Перад імі ўзнік мост пад назвай *Leabhar*, а на ім — надпіс: «Вітаем вас у Дубліне!». Перайшоўшы мост, яны сустрэлі маладую пару з шыльдачкай: «Вы прыехалі правільна! Выдатнае дзённае надвор'е!».

— Можна і мне зайсці?

— Вядома. Бо ў папярэднія разы цябе ж нішто не спыняла.

І зноў домік. Дзве дзяўчыны ў ліловых строях. Падобныя на Айнязік. Выглядаюць як яе раравесніцы. Але не блізняты. Бо гэта — я.

— *Failte roimh chach!* Мы прыгатавалі для вас кактэйль па новым рэцэпце!

Айнязік працягнула шкатулку:

— А гэта вам!

— Паглядзім, што яны зрабілі з канвертам…

— Гэтым разам я ўсё ж заінтрыгаваны… — сказаў Даянч.

— Праўда, — сказалі я. — А па дарозе сюды ты і слова не прамовіў…

Ён крыху засмуціўся. Я падняліся з месца. Схаваліся ў другім пакоі. Зрабілі ўсё, што трэба было зрабіць, запячаталі канверт. Даянч і Айнязік пазіралі на вуліцу, калі я вярнуліся.

— Не трэба быць такой злоснай, Айнязік! Ты ідзі, проста ідзі наперад! Дарога сама прывядзе цябе туды, куды трэба! — сказалі я. І выправілі яе ў дарогу.

Калі Даянч запусціў рухавік свайго аранжавага аўто, я нагадалі ёй пра заклінанне, малюючы ў паветры лічбу «5». Усміхнулася. Падаецца, што ім добра. Але вось што сапраўды цудоўна, дык гэта вечар у Стамбуле. У доме Haun квартала *Y.D.Degli* ніхто не дакранаўся да вячэры ў чаканні гэтых двух гасцей. А сямейства за сталом размясцілася немалое. Для Даянча і Айнязік трымалі два вольныя крэслы. Сямейнікаў можна было пералічыць на пальцах абедзвюх рук. Яны — гэта, канешне ж, я.

— *Mtrhabalar! Buyrun!* Сядайце хутчэй, ежа стыне. Пасля пагаворым! — сказаў адзін з мяне. — Смачна есці!

— Дзякуй, Айнязік! Дзякуй, Даянч! Частуйцеся!

За гарбатай я звярнулі ўвагу на шкатулку. Усе я разам нешта выцягнулі з яе, нешта паклалі ў яе. Маленькая шкатулка таксама патрапіла мне на вочы. Калі ў небе запалалі першыя зоркі, я не сталі затрымліваць гасцей. У двары я заспявалі ўсе разам. У гэта імгненне наляцеў марскі ветрык, і мне пачулася, быццам ён нешта шапнуў на вуха Айнязік. Адначасова ён ласкава дакрануўся яе валасоў. Так, вы надзіва здагадлівыя і ўдумлівыя — гэта і была замова.

— Ты ведаеш, адкуль трэба пачынаць? — спыталіся я.

— З пачатку, — адказала Айнязік.

— Калі ты не адшукаеш пачатак, там і пачынай!

Даянч паехаў, прасігналіўшы на сваёй машыне крэмавага колеру. Я са смехам глядзелі ім услед.

Яны ехалі цяпер у адным напрамку. Без падказак. У цемры. Да аднастайнага грукату сэрца Даянч дадаваліся стороннія, трывожныя ноткі. Айнязік высунула галаву з акна і крычала, быццам у яе роце сабраліся ўсе зямныя радасці. Пасля яна пачала гладзіць шкатулку, заўсміхалася, мігаючы вейкамі. Яна адкрыла тую шкатулку, што была зроблена са срэбра. Загучала неймаверна прыгожая мелодыя. А яшчэ з яе данёсся неверагодна прыцягальны водар. Айнязік выкінула шкатулку ў акенца. З яе залатым дажджом пасыпаліся зоркі. Даянч, агаломшаны гэтым відовішчам, спыніў машыну. Узбуджаная, шчаслівая Айнязік адчыніла дзверы і, рынуўшыся ў нябесныя прасторы, пачала раскідваць вакол зоркі, што былі падобныя да сняжынак. Машына разгойдвалася ў паветры, быццам у танцы. Айнязік набрала жменю зорак і высыпала на небасхіл. На небе з'явіўся надпіс: «Запрашаем ласкава!»

Яны спусціліся на зямлю. Не прайшло шмат часу, але адбылося шмат падзей, якія так і хочацца паспрабаваць на смак.

— Даянч, высадзі мяне там, адкуль забраў.

— Добра.

Блакітная машына затармазіла. Айнязік выйшла з машыны і працягнула другую, маленькую шкатулку кіроўцу.

— Гэта твая!

— А замова для яе не патрэбная?

— Скажы любое слова, і можаш адчыняць.

Схіліўшыся над шкатулкай, Даянч не заўважыў, як яго спадарожніца некуды знікла. Азірнуўся, але яе і след прастыў. Не марудзячы, ён адразу паехаў дахаты. Паспешліва адчыніў дзверы і куляй уварваўся ў свой пакой. Вымавіў слова і адкрыў вечка. Унутры ўбачыў розныя грашовыя купюры — гэта была плата за праезд.

З залы да яго даляцеў нязвыклы шум. У пакоі сустрэў знаёмыя твары — старога, жанчыну, дзвюх дзяўчат і вялікую сям'ю, гэта значыць, усяго мяне! І ўсе я хорам вымавілі:

— Ласкава запрашаем, Даянч!

З туркменскай. Пераклад Алеся КАРЛЮКЕВІЧА



Рэнэ Магрыт «Скрыня Пандоры».

ЯРКІЯ АКЦЭНТЫ НА СТАРОНКАХ ГІСТОРЫІ

Якія цікавыя кнігі, прысвечаныя Туркменістану, можна знайсці ў Нацыянальнай бібліятэцы?

Беларуска-туркменскія літаратурныя сувязі на працягу многіх гадоў актыўна падтрымліваюцца абедзвюма краінамі. Пісьменнікі спрабуюць максімальна шырока прадэманстраваць свой патэнцыял і пашырыць межы супрацоўніцтва. Нацыянальная бібліятэка Беларусі захоўвае вялікі архіў дакументаў (каля 7 тысяч), звязаных з Туркменістанам, а таксама шэраг унікальных туркменскіх кніг (на туркменскай, беларускай і рускай мовах), якія маюць вялікае культурнае значэнне.

У фондах Нацыянальнай бібліятэкі можна знайсці шмат цікавых і каштоўных выданняў, прысвечаных розным напрамкам развіцця Туркменістана. Тут мастацкая, навуковая, адукацыйная літаратура, але ж варта разгледзець унікальныя асобнікі, якія супрацоўнікі бібліятэкі называюць сапраўдным скарбам.

Афіцыйнае

1. Напрыклад, кніга «Выбраны і ўпаўнаважаны народам», выдадзеная туркменскім культурна-асветніцкім фондам «Бахар» і прэзентаваная ў Мінску ў 2010 годзе. Гэта эксклюзіўнае выданне на беларускай мове аўтарства Прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава.

У ёй, у прыватнасці, аўтар аддае даніну павагі туркменскай духоўнай спадчыне, багатаму гістарычнаму мінуламу свайго народа, акрэслівае планы развіцця краіны на найбліжэйшую і далёкую перспектыву, гаворыць пра маштабныя праекты, якія зменяць да лепшага жыццё туркменаў. У рэалізацыі гэтых велічных планаў не апошнюю ролю, па меркаванні пісьменніка, адыгрывае паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю.

Выданне перакладзена на замежныя мовы, прэзентацыі прайшлі ў многіх краінах, у тым ліку Вялікабрытаніі, Галандыі, Расіі. У кнізе шмат прыгожых цікавых ілюстрацый, якія сведчаць пра вялікія дасягненні Туркменістана пасля набыцця самастойнасці.

Гэта, дарэчы, не першая кніга прэзідэнта туркменскай дзяржавы, якая была прапанавана ўвазе беларускай грамадскасці. Напрыклад, улетку фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі папоўніліся выданнем «Конь — знак вернасці і шчасця» на рускай мове, якое ўбачыла свет сёлета.

Кніга ўключае восем раздзелаў, якія паслядоўна разгортваюць рэтраспектыўную панараму эвалюцыі вобраза каня ў сусветнай гісторыі. Аўтар акцэнтаваў увагу на тым, што ў класічнай літаратуры і народнай творчасці туркменаў конь займае значнае месца, а гэта з'яўляецца фактам высокага шанавання скакуноў туркменскім народам. Дарэчы, гэта ўжо пятая кніга пра конегадоўлю, напісаная прэзідэнтам Туркменіі.

Варта адзначыць і раман «Імя добрае нятленнае» (2011 г.), які Гурбангулы Бердымухамедаў прысвяціў памяці дзеда — школьнага настаўніка. Бердымухамед Анаеў шмат гадоў працаваў дырэктарам пачатковай сельскай школы, удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, дзе быў паранены. Пасля вяртання дадому зноў працаваў педагогам. Яго жыццё перапыніў ашхабадскі землятрус 1948 года. У сяле Ызгант Геакцепінскага раёна сёння пабудавана сучасная школа, якая носіць імя дзеда прэзідэнта Туркменістана.

Мастацкае

2. Нельга абысці ўвагай два мастацкія выданні, якія папулярызуюць творчасць знакамітага туркменскага класіка Маланепеса. Яны таксама займаюць пачэснае месца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Першае з іх — казачная паэма «Зохрэ і Тахір» (на рускай мове), якая ўпісала ў гісторыю сусветнай літаратуры імя Маланепеса як найярчэйшага майстра любоўна-лірычнага жанру. Казка дайшла да нашых дзён з глыбіні стагоддзяў. Гэтая прыгожая гісторыя пра каханне, высокае і светлае, і сёння карыстаецца вялікай папулярнасцю ў туркменаў.

Падрыхтоўку выдання ажыццявіла Туркменская дзяржаўная выдавецкая служба на аснове манускрыптаў з фондаў Нацыянальнага інстытута рукапісаў Акадэміі навук Туркменістана. Кніга была выдадзена спецыяльна да святкавання 200-годдзя з дня нараджэння аўтара ў 2010 годзе.

Другое выданне — вялікі зборнік паэзіі Маланепеса (2010 г.), у які ўвайшлі каля 120 вершаў на туркменскай, азербайджанскай і ўзбекскай мовах.

Навуковае

3. Вялікую цікавасць выклікаюць кнігі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі, прысвечаныя архітэктуры Туркменістана. Адна з іх «Гургендж — сярэднявечны навуковы і культурны цэнтр Усходу» Алмаза Язбердзіева, выдадзеная ў 2011 годзе і прадстаўленая адразу на туркменскай і рускай мовах.



Кніга прысвечана аднаму з самых значных помнікаў будаўнічага мастацтва Туркменістана — мячэці XV стагоддзя ў Анау блізу Ашхабада, разбуранай падчас землятрусу 1948 года. На аснове руін і гістарычных дакументаў разглядаюцца асаблівасці канструкцый будынка і яго ўнікальнага мастацкага афармлення. Падрабязна аналізуецца генезіс і семантыка ладу драконаў на партале мячэці. У кнізе можна ўбачыць рэдкія архіўныя фотаздымкі, якія аднаўляюць рэальны вобраз помніка. Менавіта гэтая кніга была адзначана дыпломам III ступені XV Міжнароднага конкурсу дзяржаў — удзельніц СНД «Мастацтва кнігі», які прайшоў у Расійскай Федэрацыі ў рамках XXXI Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

Другая кніга, прысвечаная старажытнай архітэктуры Туркменістана, — «Старажытны Мерв і будаўнічая культура эпохі Вялікіх Сельджукоў» — прадстаўляе архітэктурную спадчыну XI—XII стагоддзяў, калі на палітычнай арэне Усходу з'явілася туркмена-агузская дзяржава, якую ўзначальвала дынастыя Вялікіх Сельджукоў. У кнізе праводзіцца дэтальны архітэктурна-мастацтвазнаўчы аналіз самага значнага збудавання той эпохі — маўзалея Султана Санджара ў Мерве. Гэтаму архітэктурнаму шэдэўру раней была прысвечана манаграфія аўтара («Маўзалей султана Санджара» (Стамбул, 2004 г.), якая складае аснову дадзенага выдання.

Нацыянальнае

4. Туркменскі народ вельмі паважліва ставіцца да нацыянальных святаў і традыцый. Гэта можна адчуць, паглыбіўшыся ў чытанне кнігі «Наврузнама» (на рускай і туркменскай мовах),

якая ўяўляе сабой калектыўную працу вядомых навукоўцаў Туркменістана — гісторыкаў, філолагаў, мовазнаўцаў і этнографаў, а таксама журналістаў і грамадскіх дзеячаў краіны. На яе старонках у рэтраспектыве стагоддзяў і тысячагоддзяў паўстае невычэрпнае багацце феномена Наўруза, які і ў нашы дні працягвае сваю высокую місію — несці людзям святло прыгажосці, дабра і радасці.

У кнізе аналізуюцца творы туркменскага фальклору, звязаныя са святкаваннем Наўруза. Выданне дазваляе чытачам глыбей спазнаць прыгажосць традыцый і багацце спадчыны, дакрануцца да самой сутнасці Наўруза — свята старажытнага і вечна юнага, якое здабыла новыя фарбы і гучанне ў цяперашнюю эпоху.

Інтэрнацыянальнае

5. У фондах бібліятэкі шмат кніг туркменскіх пісьменнікаў, перакладзеных на беларускую мову. Адным з такіх выданняў з'яўляецца анталогія туркменскай дзіцячай літаратуры «Кветкі Каракумаў», што выйшла ў Мінску (1990 г). Альбо зборнік паэм і вершаў

«Мая Туркменія» (1992 г.). Нельга не згадаць зборнік твораў пісьменнікаў Беларусі і Туркменістана «Святая любоў», што выйшаў у Выдавецкім доме «Звязда» ў 2013 годзе і выклікаў вялікую цікавасць у прыхільнікаў сапраўднай літаратуры.

Вікторыя АСКЕРА

«Не журыся, мой сябра...»

Усё далёкае і нязведанае вабіць. Асабліва тое, што захінута покрывам таямніцы іншай традыцыі і культуры. Гэтак жа і адносна літаратуры: калі надрукаванае лацініцай альбо кірыліцай на любой са славянскіх ці германскіх моў можна хаця б часткова прачытаць і зразумець, то сэнс схаваных пад узорамі вязі цюркамоўных шрыфтоў для большасці застаецца няясным ад пачатку да канца. Якія яны, творцы далёкага Туркменістана?..

Зборнік паэзіі Махтумкулі «З кубка вечнасці мёд», перастворaны па-беларуску, які пабачыў свет да юбілею класіка ў 2014 годзе, толькі распальвае полымя цікаўнасці высечанымі, здавалася б, на скрыжалях гісторыі радкамі:

Куды б нас шляхі па жыцці ні вялі,
Расступяцца горы, што ёсць на зямлі,
Нашчадкам запомніцца Махтумкулі,
Ён вуснамі станецца роднай Туркменіі...

Паэзія была для яго пакутай. Рамёствы ювеліра, рымара, каваля, якімі ён авалодаў, не пазбавілі яго прагі наталення Словам — ні ў радасці, якая была рэдкім госцем у яго жыцці, ні ў бедах, якіх лёс адмераў з лішкам (таму паэт і падпісваў творы псеўданімам Фрагі, што значыць разлучаны са шчасцем)...

У XVIII стагоддзі жыў і іншы вялікі туркменскі паэт — Андаліб (каля 1712—1780). Ён з'яўляецца адным з заснавальнікаў туркменскай літаратурнай мовы. Шырока распрацоўваў фальклорныя сюжэты, тэматычна і жанрава ўзбагаціў туркменскую паэзію. Пісаў пра няпростую долю звычайнага селяніна, у паэме «Несімі» распавёў пра трагічны лёс азербайджанскага паэта XIV стагоддзя. Многія з яго твораў сталі народнымі песнямі.

Беларускі чытач сустракаў гэта імя на старонках айчыннага друку: летась у адным з нумароў «ЛіМа» былі надрукаваны два вершы класіка, перастворaныя па-беларуску Юліяй Заблоцкай-Шостак: «У бясконцых пакутах» і «Галеча».

У першым з іх — глыбока інтымныя перажыванні з нагоды расстання з каханай. Выказанае ў словах высокае пачуццё пераконвае: паўсюль, ва ўсе часы чалавека аднолькава акрыляе моц узаемнага кахання і паліць агонь рэўнасці альбо астуджае холад непаразуменняў і крыўдаў:

Мілая, літасць ты май да мяне —
Царскі палац мне здаецца турмой.
Я ўвесь знямог ад спякоты кахання —
Хворы хаджу зноў да світання.
Сэрца наскрозь мне працяла страла —
Вось і канаю ад раны расстання.

Сумныя перажыванні і ў другім з надрукаваных вершаў. Таксама зразумелыя многім: не да насалоды гармоніяй і прыгажосцю свету, калі няма чаго з'есці... Але мора нягод і тугі, якім бы беспрасветным ні падавалася ў тую шараю гадзіну, не паглынае зусім, пакідае месца надзеі:

Кажа вам Кемінэ: тых — казной залатой,
Гэтых — лёс надзяляе кішэняй пустой.
Не журыся, мой сябра, хадзем жа са мной.
Будзе час — і ад нас адступіць галеча.

Перанесціся з той далёкай эпохі ў першую палову XX стагоддзя, не менш драматычны ў гісторыі Туркменістана час, прапануе знаёмства з Агулбіке Аразгельдыевай. На старонках жнівеньскай «Маладосці» за 2018 год змешчаны артыкул пра яе нядоўгае жыццё і творчасць, а таксама падборка вершаў, перастворaная па-беларуску Міколам Мятліцкім. Хуткі позірк на іх «па дыяганалі» можа стварыць уражанне местачковасці, абмежаванасці пэўнымі геаграфічнымі і асобаснымі каардынатамі: шмат імёнаў, назваў населеных пунктаў, паняццяў, якія ўжываюцца толькі ў тых краях. Але варта ўчытацца — і не адчуваеш ні геаграфічнай, ні ментальнай аддаленасці! Бо лёс і выпрабаванні лірычнай гераіні (якая не адлучана ад асобы паэтэсы) — агульны з лёсамі і пакутамі мільёнаў суайчыннікаў, якія прайшлі праз калектывізацыю, раскулачванне, ссылкі, вайну і страты самых блізкіх людзей:

У дзень адзін я стала сіратой,
І чаша лёсу поўная да слёз.
Бацькі пагнаны ў ссылку свалатой,
Мяне слязьмі умыў іх скрушны лёс.

Агулбіке і яе старэйшая сястра былі яшчэ дзецьмі, калі іх разлучылі з бацькамі... Радаваліся ўсім аулам, калі ад родных прыходзілі весткі, і пазней, калі са ссылкі вярнулася жонка старэйшага брата Агулбіке (пакінуўшы там магілу 28-гадовага мужа)...



За часам вайны — новае гора. У 1941 годзе яны з аднавяскоўцам Агаберды пабраліся шлюбам. Разам былі ўсяго два месяцы, а калі пачалася вайна, муж Агулбіке сышоў на фронт. Непражытую, неадданую любоў і пяшчоту маладая паэтэса ўкладала ў творы... У 1949 годзе Агулбіке Аразгельдыева, так і не дачакаўшыся з вайны каханага (ён загінуў на 1-м Беларускім фронце), пайшла з жыцця...

Як прывітанне з Каракумскай старонкі — падборка вершаў сучаснай туркменскай паэтэсы Чэмен Анабердыевай (нарадзілася ў 1966 годзе), перастворaная па-беларуску Марыяй Кобец («ЛіМ», № 13, 2017). Захапленне маладосцю, жыццём, інтымная лірыка, філасофскае асэнсаванне ўзаемаадносінаў — матывы творчасці паэтэсы. Тое, што яе хвалюе, блізкае і зразумелае ўсім:

Ад сяброўства да крыўды — хвіліна хады
І мяжа з недамовак згрызотных.
І маўчыш... Толькі вочы — яскравей вады.
Толькі вочы не зманяць, як, пэўна, і ты —
Ці сябры ж мы з табою, ці... Хто ты?

Калі паэзія Туркменістана гаворыць мовай пачуццяў, адлюстроўвае тое, што адчуваў хоць некалі кожны, то сучасная проза — глыбокае пранікненне ў сутнасць душы гэтага краю, асэнсаванне светапоглядных асноў, светаўспрымання. Апавяданні, якія летась пабачылі свет на старонках нашага друку («Цягнік праходзіць» Атаджана Тагана ў снежаньскім «Полымі» і «Свята» Максата Бяшымава ў жнівеньскай «Маладосці»), усебакова паказваюць менталітэт туркменскага народа. Тэмы расповедаў — чалавек, яго жыццё, наканаванне, лёс, вернасць, доўг.

У першым з твораў чытач услед за журналістам, які выконвае рэдакцыйнае заданне, трапляе ў госці да 90-гадовага чабана. Той нястомна працаваў усё жыццё... У друку віталі б з'яўленне нарыса пра яго годную старасць і адпаведную доўгім гадам працы ўзнагароду...

Атаджан Таган — творца вельмі тонкі: не называючы наўпрост з'явы і не выносячы ніякіх вердыктаў і ацэнак, пісьменнік падводзіць чытача да высновы праз дэталі... І пасля прачытання застаецца адчуванне мяккай іроніі аўтара. Яна — спрэс: «...дабраўся да сяла пад назвай Адалат, што ў перакладзе з туркменскай гучыць як "справядлівасць". ...Мне сустрэліся дзве хаціны, пабудаваныя з камякоў гліны, пра што ў наш час ужо даўно забыліся. Але былі і шыкоўныя дамы, складзеныя з выпаленай цэглы. Домік Махмуда ага нельга было параўнаць ні з чым...».

У апавяданні «Свята» падзеі пададзены праз расповед хлопчыка. Максат — майстар інтрыгі. Яго герой — самы звычайны школьнік. І толькі калі пласт за пластом адкрываюцца, быццам незнарок, рэаліі жыцця яго сям'і, чытач застаецца ўражаным мужнасцю і трываласцю героя: «Цяпер я ўжо бацька. І рысы той маленькай дзяўчынкі, рысы маёй сястры, я знаходжу ў паводзінах сваёй дачкі. Неяк усё перамясцілася. Мая дачка — у маіх успамінах. І мая маленькая сястра — сёння са мною. У любы момант, у любую хвіліну. Дачушка паўтарае ўсё — какетнічае, танцуе перад люстэркам, а то хапае мяне за рукаў і плача разам са мною. Магчыма, увесь сакрэт у тым, што я і сам застаўся пажыццёвым вязнем таго часу, тае цямніцы за высокімі сценамі, як і наша мама засталася вязнем таго астрогу, мама, якая таксама адбывала свой пажыццёвы тэрмін да апошняга дыхання. Дарэчы, як і ўсе тыя людзі ў двары... Мне здаецца, яны да гэтага часу нясуць свой крыж, чакаюць лязгату дзвярэй, жывуць надзеяй, што і ім пашчасціць адведаць ад свайго кавалачка торта».

Магчыма, людзі ў двары — гэта мы, кожны з нас...

Яна БУДОВІЧ

БЕЛАРУСКІЯ АЎТАРЫ

ў часопісе «Дунья эдэбіяты»

У Беларусі і Туркменістана складваюцца неблагія літаратурныя стасункі і на сучасным этапе. Як сведчанне — гасцяванне ў Мінску ў апошнія гады туркменскіх паэтаў і празаікаў: Агагельды Аланазарава, Героя Туркменістана Газель Шагулыевай, Бягуль Анабаевай і інш.

А ў Туркменістан за апошняе дзесяцігоддзе наведаліся беларускія пісьменнікі і кнігавыдаўцы. Сярод іх — Алесь Бадак, Алена Масла, Аляксандр Аксёненка, Уладзіслаў Мачульскі, Дзмітрый Макараў, Алесь Карлюкевіч, Юлія Алейчанка, Уладзімір Андрыевіч. У Выдавецкім доме «Звязда» пабачылі свет дзве кнігі, прысвечаныя беларуска-туркменскім літаратурным сувязям: на беларускай і рускай мовах.

На старонках літаратурна-мастацкага часопіса «Дунья эдэбіяты» («Сусветная літаратура») неаднойчы выступалі са сваімі творамі беларускія пісьменнікі. Туркменскія перакладчыкі звярталіся і да перакладу класічных твораў айчыннай літаратуры. У 3-м нумары «Дунья эдэбіяты» ў 2012 годзе была надрукавана падборка вершаў Алеся Бадака, народных паэтаў Беларусі Максіма Танка, Ніла Гілевіча. Пераўвасобіў іх творы на туркменскую мову Набаткулы Рэджэпаў. Ён і ў ранейшыя дзесяцігоддзі звяртаўся да перакладаў беларускай паэзіі. У 4-м нумары часопіса за 2012 год (а выходзіць «Дунья эдэбіяты» адзін раз на два месяцы) — яшчэ адна публікацыя: апавяданне народнага песняра Беларусі Якуба Коласа. Перакладчык — Агульгазель Шагулыева.

У 1-м нумары за 2015 год часопіс змясціў гутарку з Алесем Карлюкевічам пра развіццё беларуска-туркменскіх літаратурных сувязяў на розных этапах гісторыі. Дарэчы, вытокі — яшчэ ў XIX стагоддзі, калі Аляксандр Ходзька ў Каракумскім краі адшукаў тэксты неўміручай паэзіі Махтумкулі. Між іншым, ужо ў XXI стагоддзі вялікую працу па пераўвасабленні паэзіі Вялікага Махтумкулі Фрагі на беларускую мову зрабіў паэт Казімір Камейша.

За такі творчы плён беларускі літаратар быў адзначаны ордэнам Махтумкулі. У 1985—1988 гг. ён жыў і працаваў у Туркменістане. І пасля неаднойчы наведваўся ў Ашхабад. У маі наступнага, 2016, года «Дунья эдэбіяты» друкуе паэтычную падборку з твораў Янкі Купалы, Сяргея Законнікава, Максіма Танка, Уладзіміра Някляева, Ніла Гілевіча. Перакладчык — зноў Набаткулы Рэджэпаў. У гэтым жа нумары — і вершы Адама Шостака (у перакладзе Максата Бяшымава), Міколы Мятліцкага (у перакладзе Сеітмурада Гельдыева), артыкул Алеся Карлюкевіча пра сучасную беларускую літаратуру.

У 2018 годзе часопіс «Дунья эдэбіяты» двойчы даваў магчымасць выступіць у выданні беларускім аўтарам. У трэцім нумары змешчаны артыкул Алеся Карлюкевіча пра народнага пісьменніка Туркменістана Керыма Курбанняпесава (1929—1988), якога ведае па перакладах на беларускую мову і наш чытач. У трэцім нумары — гутарка з маладой беларускай пісьменніцай Юліяй Алейчанкай.

Трэці нумар «Дунья эдэбіяты» за 2018 год змясціў тры нарысы-ўспаміны Алеся Карлюкевіча пра пісьменнікаў Туркменістана, з якімі ён быў знаёмы, сябраваў, часта сустракаўся ў 1980-я гады, — Каюма Тангрыкуліева, Какабая Курбанмурадава, Какалы Бердыева. Іх даўно ўжо няма сярод жывых. Але варта нагадаць і пра тое, што ў кожнага са згаданых пісьменнікаў — свая повязь з Беларуссю. Народны паэт Туркменістана Каюм Тангрыкуліеў гасцяваў у Беларусі ў 1986 годзе, напісаў верш, прысвечаны Хатыні.

Какабай Курбанмурадаў таксама прыязджаў у Мінск, адпачываў у Доме творчасці «Іслач» на беразе ракі з аднайменнай назвай Іслач. Какалы Бердыеў сябраваў з беларускімі пісьменнікамі, якія жылі і працавалі ў Туркменістане, — Міхасём Карпенкам, Мікалаем Калінковічам. А болей як паўстагоддзя таму сумесна з Алесем Адамовічам вандраваў па Туркменістане, у выніку чаго нарадзіўся сумесны нарыс К. Бердыева і А. Адамовіча пра Каракумскі канал. Нарыс надрукаваны ў беларускім «Полымі», туркменскім часопісе «Савет эдэбіяты», маскоўскім часопісе «Дружба народов». Пераклаў нарысы-ўспаміны Алеся Карлюкевіча на туркменскую мову Анакг Атаеў.

Будзем спадзявацца, што і надалей творчая дружба часопіса «Дунья эдэбіяты» з Беларуссю і беларускімі пісьменнікамі прадоўжыцца.

Мікола БЕРЛЕЖ

Любоў ТУРБІНА:

«Ашхабад трымаю ў памяці»

Любоў Турбіна нарадзілася ў Ашхабадзе ў 1942 годзе. У Каракумскі край Туркменістана яе сям'я трапіла ў час Вялікай Айчыннай вайны. У хуткім часе пасля нараджэння дзяўчынкі Турбіны вярнуліся ў Расію. Пасля быў Мінск, дзе прабеглі школьныя гады, юнацтва, час студэнцтва. У Беларусі адбылося і станаўленне будучай пісьменніцы. Як паэтэсы, як літаратуразнаўцы.

Некаторы час вядомая руская паэтэса і празаік Любоў Турбіна працавала ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі. Займалася вывучэннем повязяў беларускай літаратуры з азербайджанскай, туркменскай і ўзбекскай літаратурамі. Цяпер Любоў Мікалаеўна жыве ў Маскве, працуе ў Інстытуце сусветнай літаратуры Расійскай акадэміі навук. З пісьменніцай і літаратуразнаўцам — наша размова пра повязі беларускага прыгожага пісьменства з цюркамоўным светам.

— Любоў Мікалаеўна, калі вы адкрылі для сябе тэму «Кантакты Беларусі з цюркамоўнымі літаратурамі»?

— Прызнацца, тэма «Сувязі беларускай літаратуры з цюркамоўнымі літаратурамі СССР» у Інстытут імя Янкі Купалы была «спушчана зверху» якраз тады, калі я скончыла Літаратурны інстытут імя Максіма Горкага. Я сама напрасілася на гэты клопат. Бо генетычна трымала ў памяці сваё нараджэнне ў сталіцы Туркменістана.

— Ці займаліся такой альбо блізкай тэмай раней?

— Моў усходніх ніхто не ведаў. У гэтым — прычына. І, адпаведна, да мяне ніхто цюркамоўнымі літаратурамі не займаўся. Літаратурныя сувязі з рэспублікамі Каўказа, Сярэдняй Азіі складваліся за кошт стасункаў паэтаў, празаікаў, якія шмат куды ездзілі.

— Так, і я памятаю, што ў 1980-я гады мне расказвалі туркменскія пісьменнікі пра сустрэчы з беларускімі паэтамі ў Каракумскім краі ў розныя дзесяцігоддзі — пра Алеся Адамовіча (распавёў Какалы Бердыеў), Алеся Жука і Міколу Калінковіча (Керым Курбанняпесаў), Любоў Філімонаву (Курбан Чаліеў)…

— Вось яны і ездзілі ў творчыя камандзіроўкі, на розныя фестывалі. І прывозілі з далёкіх старонак цікавыя ўражанні — у вершах, апавяданнях, нарысах… Так, у Рыгора Барадуліна быў нарыс «Браты па агню». Шмат чаго якраз і даведалася з гэтага тэксту. Шукала і іншыя крыніцы…

— Чаму ў якасці разгалінаванняў вашых даследчыцкіх кірункаў былі абраны менавіта туркменская, азербайджанская і ўзбекская літаратуры? Ці не было жадання звярнуць увагу на турэцкую літаратуру?

— Спачатку я хацела заняцца туркменскай мовай і пачаць менавіта з яе вывучэння. Але не знайшла настаўнікаў. Затое быў знаёмы яшчэ па інстытуце фізікі, дзе была на практыцы, пакуль вучылася ў Белдзяржуніверсітэце. Азербайджанскі камуніст… На той час ён быў абязножаны і знаходзіўся дома. Але розумам — надзіва дзеяздольны. І сам прапанаваў мне займацца. Нават не за грошы — проста вельмі сумаваў па роднай мове. А яшчэ прачытала пра азербайджанскую мову, што ў XIX стагоддзі яна была падобная на французскую. Універсальная і вельмі прыдатная на практыцы. Пасля мне даслалі падручнік туркменскай мовы. І ўжо па ім Давуд Шчэрбаб стаў вучыць мяне туркменскай мове.

— Яны вельмі блізкія — туркменская і азербайджанская... Неяк на кніжнай выстаўцы ў Мінску мы з азербайджанскім паэтам Чынгізам Алі аглу гарталі туркменскі часопіс. Здаецца, «Дунья эдэбіяты» — «Сусветную літаратуру». Чынгіз-ага ўсё спакойна перакладаў…

> *«Асаблівую цікавасць па-ранейшаму выклікаюць повязі беларускай літаратуры з усходнімі літаратурамі. Спадзяюся на новыя здабыткі ў гэтым кірунку. Мажліва, нешта і сама яшчэ перакладу з туркменскай, азербайджанскай, узбекскай літаратур».*

— І мне гэта таксама адкрылася адразу. У сакавіку 1986-га паехала ў Баку для вывучэння азербайджанскай мовы ажно на тры месяцы. Так планавалася... Але жыццё распарадзілася іначай. Грымнуў Чарнобыль. І я вярнулася ў Мінск, да сям'і.

— Для даследавання тэмы вы ўсур'ёз узяліся за асваенне азербайджанскай мовы. Цікавіла вас і туркменская... Наколькі паспяхова ў гэтым засваенні прасоўваліся? Ці перакладалі азербайджанскую паэзію?

— Вершы я пішу на рускай мове. І, адпаведна, вершы азербайджанскіх паэтаў перакладала на рускую. Перш-наперш — творы Вагіфа Самедаглы, сына Самеда Вургуна, які быў яшчэ і музыкантам. Мае пераклады яго вершаў змясціў мінскі часопіс «Всемирная литература». Здаецца, напрыканцы 1999 года. Былі і іншыя пераклады, але яны не друкаваліся… З туркменскіх паэтаў шмат перакладала з паэзіі Атамурада Атабаева…

— Дарэчы, народны паэт Туркменістана Атамурад Атабаеў — перакладчык і беларуса Алеся Бадака… Яны сустракаліся ў Ашхабадзе.

— Не ведала пра гэта. Вершы Атамурада Атабаева друкаваліся ў маіх перакладах на рускую мову ў ашхабадскім часопісе «Юность»…

— Двухмоўнае выданне. Туркменская версія — «Яшлык». У часопісе выступала і беларуская даследчыца, пісьменніца Любоў Філімонава.

— Ёсць у мяне і вершы, прысвечаныя Атамураду Атабаеву…

— Якія публікацыі сталі вынікам вашых даследаванняў адносна повязяў беларускай літаратуры з цюркамоўнымі літаратурамі?

— Былі надрукаваны два грунтоўныя артыкулы — «Беларуска-азербайджанскія літаратурныя сувязі савецкага перыяду» і «Беларуска-ўзбекскія літаратурныя сувязі». Яны выйшлі ў «Докладах АН БССР».

— З 2001 года вы ў Маскве. Працуеце ў Інстытуце сусветнай літаратуры Расійскай Акадэміі навук. Ці сочыце за развіццём міжнародных стасункаў беларускай літаратуры?

— Асаблівую цікавасць па-ранейшаму выклікаюць повязі беларускай літаратуры з усходнімі літаратурамі. У мяне ёсць многія выданні, якія пабачылі свет у апошнія гады. Спадзяюся на новыя здабыткі ў гэтым кірунку. Мажліва, нешта і сама яшчэ перакладу з туркменскай, азербайджанскай, узбекскай літаратур.

Гутарыў Кастусь ЛАДУЦЬКА

АДЦЕННІ ВОСЕНІ

(Туркменскія радкі)

Любоў ТУРБІНА

***

Дажджы ў Ашхабадзе — прыродзе наўздзіў,
Пустыня — і раптам залева!
…Адзіны той край, што цябе нарадзіў,
Адно — радаводнае дрэва.
Сухімі пяскамі карміла вайна
Той горад любові, няйначай!
А ў кожнага маці таксама адна:
Замоўкне — і раптам заплача…

АШХАБАД

Як хмара, навіс над краінай той год,
З якога мой лёс пачынаў свой узлёт.
Спякота, нястачы і мноства нягод,
Здалёку гучалі грымоты,
А сэрцы сціскаліся ўпотай.

І нас, немаўлят, сілкавалі тады
Прыроды дарункі, лагода вады,
Матулін пяшчотны пагляд малады.
І хлебны паёк ледзь набыты
Усіх ратаваў ад нябыту.

Ды здані расталі часінаў ліхіх…
Яны — цяпер вехі ў блуканнях маіх.
Ды бляск азіяцкі тых зор залатых
І сёння чароўны, панадны
Над родным маім Ашхабадам.

***

Шмат новых людзей з незнаёмых мясцін
Сустрэлі — гасцінных і шчырых…
Праводзіны скрозь, дзіўны вэрхал адзін —
Прабач, кліча зноў мяне вырай.
Будзённасць з каханнем не сумясціць.
Качэўніца вечная, рада,
Што ў вершах маіх неўтаймоўна бурліць
Вандроўная кроў Ашхабада.
Няўмольна гады ўсё ж вядуць свой адлік —
Магчыма, пара мне вяртацца
Туды, дзе сінеецца ціхі арык,
Каб там з мітуснёй развітацца.
Ды ў цьмяных глыбінях шалеюць віры,
Расстанне пустэчаю зеўрыць.
Відаць, нам адно застаецца, сябры:
Трываць, спадзявацца і верыць.

***

У Краснаводску — зор шацёр
Над скверыкам сіроцкім,
І ноч усю марскі дазор
Не спаў у Краснаводску.
А з гор спрадвечны сум спаўзаў,
Ты быў пяшчотна-бестурботны,
З упартасцю не заўважаў
Маёй сумоты.
Мы елі дыню — райскі плод
З самой пустыні.
Там, дзе ў Эдэм быў уваход,
Мы елі дыню.
Ладдзёй Харона — ў небыццё,
Зваротнага няма парома…
Ратуючы сваё жыццё,
Мы беглі ад Харона.

Пераклад з рускай мовы Янкі ЛАЙКОВА.

СІМВАЛЫ СЯРЭДНЕАЗІЯЦКАЙ КРАІНЫ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

Беларусь і Туркменістан на працягу многіх гадоў актыўна супрацоўнічаюць у палітычнай і эканамічнай сферах. З часоў існавання Савецкага Саюза паміж краінамі захаваліся сяброўскія адносіны, і гэта дапамагае абодвум бакам перспектыўна працаваць у самых розных напрамках. Падчас афіцыйных візітаў прэзідэнтаў вырашаюцца важныя пытанні, ставяцца задачы на будучыню, а таксама ўмацоўваюцца культурныя сувязі: кіраўнікі дзяржаў абменьваюцца падарункамі, якія нагадваюць пра нацыянальныя традыцыі, каштоўнасці і патэнцыял кожнай з краін.

У Палацы Незалежнасці можна ўбачыць шмат культурных каштоўнасцей Туркменістана. Адна з іх — традыцыйны туркменскі дыван, які Гурбангулы Бердымухамедаў прэзентаваў Аляксандру Лукашэнку падчас адкрыцця Пасольства Туркменістана ў Беларусі. Падарунак займае адно з найважнейшых месцаў у беларускай калекцыі туркменскіх прэзентаў.

Дыван — не проста туркменскі сімвал, але і ўнікальная з'ява культуры сярэднеазіяцкай дзяржавы. Туркменскія дываны, пераважны колер якіх цёмна-чырвоны, ткуць у хатніх умовах з воўны, бавоўны і шоўку. Легенда гаворыць, што «запаветы», пакінутыя Огуз-ханам (легендарным продкам туркменаў) сваім сынам, закладзены ва ўзорах туркменскага дывана.

Кожны туркменскі дыван мае свой непаўторны ўзор. Але ўсе яны, нягледзячы на адрозненні, маюць агульную семантыку. Туркменскія дываны нароўні са строга геаметрычным арнаментам маюць шматлікія стылізаваныя выявы жывёл: бараноў, вярблюдаў, коней, птушак і іншых, а таксама зямлі ў Сусвеце.

У Туркменістане ёсць Міністэрства дываноў, якое займаецца захаваннем традыцый ручнога ткацтва. Калі чалавек хоча купіць дыван, ён павінен падрыхтаваць шмат дакументаў, што ўдакладняюць узрост, рэгіён паходжання, якія выкарыстоўваюцца матэрыялы, імя прадаўца, дзень набыцця, і падаць усё гэта ў міністэрства, якое дае дазвол на вываз з краіны. У апошнюю нядзелю мая ў Туркменістане адзначаецца Дзень дывана. Гэтае нацыянальнае свята было заснавана яшчэ да абвяшчэння незалежнасці краіны ў 1991 годзе.

Дарэчы, у адказ на каштоўны падарунак Аляксандр Лукашэнка падарыў лідару Туркменістана таксама дыван, толькі з беларускімі матывамі, які дэманструе сімвалы нашай нацыянальнай культуры. Насамрэч дыван, падараваны Прэзідэнту Беларусі падчас адкрыцця будынка Пасольства Туркменістана ў Мінску, не адзіны. Падчас візітаў дэлегацыі з Туркменістана прывозілі ў Беларусь таксама і маленькія нацыянальныя дываны.

Яшчэ адзін з каштоўных туркменскіх падарункаў, які знаходзіцца ў Палацы Незалежнасці, — статуэтка каня. Для туркменскага народа гэтая жывёла мае асаблівае значэнне. Бо спрадвеку ў туркменаў сфарміраваўся культ каня як вернага і надзейнага спадарожніка на ўсім шматвяковым шляху гістарычнага развіцця. Таму далёка не выпадкова, што ў цэнтральнай частцы герба Туркменістана на блакітным фоне красуецца цудоўны ахалцекінскі конь Янардаг.

Дарэчы, адным з найважнейшых дзяржаўных свят Туркменістана з'яўляецца Дзень туркменскага скакуна, да якога прымяркоўваецца міжнародная навуковая канферэнцыя, што збірае спецыялістаў па ахалкецінскіх конях з усіх краін свету. У туркменаў ёсць цікавая традыцыя — даваць скакунам паэтычныя, узнёслыя імёны, што таксама сведчыць пра павагу да сваёй культуры.

Акрамя таго, у спіс падарункаў з туркменскага боку, якія знаходзяцца ў Палацы Незалежнасці, увайшлі некалькі кніг аўтарства Гурбангулы Бердымухамедава, якія расказваюць пра найважнейшыя падзеі ў дзяржаве, а таксама пра розныя аспекты культуры краіны.

Усе прадстаўленыя экспанаты з'яўляюцца каштоўнасцю для Беларусі. Менавіта яны нагадваюць пра важныя праекты і задумы, якія абмяркоўваліся падчас афіцыйных візітаў, а таксама аб'ядноўваюць культуры, дапамагаюць народам быць бліжэй.

Вікторыя АСКЕРА

спрадвечнае

ТОП-5 адметных традыцый Туркменістана

Кожная краіна свету клапоціцца пра захаванне сваёй гісторыі, нацыянальных каштоўнасцей. Туркменістан не выключэнне. На тэрыторыі гэтай краіны заўсёды жыў неабыякавы народ, які да сённяшняга дня актыўна ўдзельнічае ў працэсах папулярызацыі сваёй культуры.

Туркменістан — краіна, у якой асабліва беражліва ставяцца да традыцый і звычаяў, многія з якіх склаліся пад уплывам рэлігіі. І гэта невыпадкова: у Туркменістане досыць строга выконваюцца законы шарыяту, якія служаць своеасаблівымі правіламі, абавязковымі для ўсіх. Ісламская рэлігія адыгрывала важную ролю ў станаўленні туркменскіх традыцый на працягу стагоддзяў. Яна і цяпер складае аснову жыцця насельніцтва, у тым ліку і мола дзі. Мусульманскія абрады і звычаі сталі агульнанацыянальнымі і выконваюцца практычна ўсім карэнным насельніцтвам краіны.

Пачаўшы вывучаць культуру Туркменістана, можна знайсці шмат цікавых традыцый, якія ўласцівыя толькі гэтаму рэгіёну. Карэспандэнт «ЛіМа» паспрабавала знайсці ТОП-5 унікальных і цікавых традыцый і звычаяў туркменскага народа.

1. Традыцыі гасціннасці

Першае, на што заўсёды звяртаюць увагу людзі, якія прыехалі ўпершыню ў Туркменістан, — гэта бязмежная ветлівасць і гасціннасць. Калі вас запрасілі ў традыцыйны туркменскі дом, то будзьце гатовыя да сапраўднага балявання, дзе кожны элемент мае сакральнае значэнне.

Усё пачынаецца з абруса, які выкарыстоўваецца для сервіроўкі стала. Вельмі дрэннай прыметай лічыцца наступіць на яго ці запэцкаць. Перад тым як туркмен пачне атрымліваць асалоду ад трапезы, ён абавязкова павінен уславіць Госпада. Ва ўсходняй традыцыі лічыцца, што кожнага госця да дзвярэй прававернага мусульманіна прыводзіць сам Алах, таму вялікім грахом лічыцца дрэнна прыняць падарожніка.

Этнографы, якія займаліся вывучэннем гэтага пытання, лічаць, што такая традыцыя зарадзілася ў старажытнасці. У тыя далёкія гады туркмены жылі ў пустыні з вельмі абмежаванымі рэсурсамі для выжывання, таму неабходна было падтрымліваць адзін аднаго. Таму, трапіўшы ў Туркменістан, ведайце, што нават у аддаленых раёнах краіны вы можаце разлічваць на хлеб і соль, якія, як і трапезны абрус, лічацца святымі.

2. Шлюбныя рытуалы

Класічная вясельная цырымонія ў Туркменістане звязана з вялікай колькасцю легенд і паданняў. Асаблівае месца ў ёй займае рытуальнае адзенне, кожны элемент якога нясе свой сэнс. Менавіта таму будучыя жаніх і нявеста, а таксама бацькі маладых аддаюць нямала часу пад рыхтоўцы да вяселля. Лічыцца, што калі нават адзін элемент вясельнага ўбрання будзе падабраны няправільна, гэта можа наклікаць мноства нягод на будучую сям'ю.

Сукенка нявесты, пры ўсёй стрыманасці і кансерватыўнасці крою, заўсёды багата ўпрыгожваецца вышыўкай і ювелірнымі вырабамі, якія прышываюць на грудзі ў некалькі радоў (яны выконваюць функцыю абярэгаў). Падчас руху ўпрыгажэнні меладычна гучаць і тым самым адганяюць злых духаў, якія, паводле паданняў, увесь час круцяцца каля маладой жанчыны, прыцягнутыя яе прыгажосцю. Наогул, нявесту берагуць ад злых сіл усімі даступнымі сродкамі: хаваюць яе пад накідкамі, уплятаюць у вясельны ўбор мноства абярэгаў, упрыгожваюць рукі дзяўчыны талісманамі.

Асноўныя вясельныя ўрачыстасці ў Туркменістане адбываюцца ў доме жаніха, хоць пачынаецца вяселле па традыцыі ў нявесты.

Белы колер займае цэнтральнае месца ў туркменскіх абрадах. Абрад сватаўства пачынаецца з уручэння маці будучага жаніха беласнежнага вузельчыка з прысмакамі і цукрам. Пасаг маладой складваюць таксама ў беласнежныя чувалы. Белай хусткай падвязваюць галаву засватнай дзяўчыны, і з гэтага часу яна афіцыйна прызнаецца заручанай.

Раней усе падарункі маладым прыносіліся ў спецыяльных вузельчыках, зробленых з каляровых хустак. Найбольш каштоўным вясельным падарункам у Туркменістане лічылася дарагая хустка з разнастайнымі ўпрыгожваннямі. Яна ж і выкарыстоўвалася і ў вясельнай працэсіі. Дарэчы, цяпер, калі ў госця краіны ёсць жаданне паглядзець традыцыйную вясельную цырымонію ў Туркменістане, можна пра гэта дамовіцца з адміністрацыяй гатэля, у якім ён спыніўся. Як правіла, многія гасцініцы краіны гатовы арганізаваць такія экскурсійныя туры.

3. Новы год

Любімае свята туркменаў — Новы год — адзначаецца вясной. Па ўсходнім паданні, у ноч з 21 на 22 сакавіка з-пад зямлі падымаецца ўсёмагутны дух, які прыносіць святло, што ацаляе хворых і сляпых і, самае галоўнае, дорыць мір усім вернікам. У Туркменістане лічаць, што з надыходам свята спыняюцца войны і любыя канфлікты.

Навагодні стол, як правіла, упрыгожваюць 7 страў, якія ўказваюць на сем дзён тыдня. Напрыклад, перад гаспадаром ставіцца сем кубкаў з напоямі, прыгатаванымі з сямі відаў травы. Туркмены стараюцца прыгатаваць ежу, якая падкрэслівае дастатак і багацце. Гаспадыні накрываюць дастархан (стол), на якім абавязкова павінны быць наступныя прадукты: малако, якое сімвалізуе чысціню, прысмакі — радасць жыцця, цукар — дастатак, шчарбет — адпачынак. Галоўныя навагоднія стравы — сумаляк, плоў і шурпа з бараніны. Кожны з запрошаных гасцей павінен пакінуць дом сытым і задаволеным: тады год будзе шчаслівы і ўраджайны.

4. Традыцыйнае шанаванне старэйшых

Паважлівае стаўленне да старэйшых таксама грунтуецца на старажытных традыцыях. Недапушчальна не выканаць іх просьбу, спрачацца з імі, глядзець на іх спадылба або выказваць сваю незадаволенасць, чакаць падзякі за нейкую паслугу або нагадваць пра яе. Звычаі патрабуюць шанавання бацькоў і наогул старэйшых. Туркменская прымаўка абвяшчае: «Золата і срэбра не старэе, бацька і маці кошту не маюць». Бацька як галоўны ў сям'і мае права ацэньваць учынкі сваіх дзяцей, а таксама абавязаны абараняць іх. Дзеці павінны з глыбокай павагай ставіцца да маці і паважаць яе. Праява дрэнных адносін ці непавагі да маці асуджаецца.

5. Традыцыі маральнасці

Туркмены — высокамаральны народ. У сваім стаўленні да жыцця яны культывуюць гасціннасць, шанаванне старэйшых, сціпласць, высакароднасць, праўдзівасць, сумленнасць, смеласць, душэўную шчодрасць.

Гэты народ высока ставіць паняцце гонару. «Мой гонар — гэта гонар маёй сям'і, майго племя, майго народа», — любяць паўтараць яны. У туркменаў моцна развіты так званы дух сваяцтва. Яны заўсёды шанавалі шчырасць. «Гавары праўду, нават калі яна супраць цябе», — абвяшчае народная мудрасць.

У туркменскім грамадстве заўсёды негатыўна ставіліся да дрэнных слоў, лічачы, што «той, хто пляткарыць з табой, пляткарыць і ў твой адрас». І, вядома ж, асуджаліся такія ганебныя рысы, як баязлівасць, маладушнасць, няўдзячнасць.

Туркмены шануюць пачуццё дружбы і любові, падтрымліваюць добрыя адносіны з суседзямі. Ёсць мноства народных прымавак на гэтую тэму: «Перш чым пабудаваць дом, даведайся, хто твой сусед», «жыві па суседстве са шчаслівым, і сам будзеш шчаслівы», «у першую чаргу паклапаціся пра суседа», «блізкі сусед лепшы, чым далёкі брат».

Вікторыя АСКЕРА

Жыві і дай жыць іншым

Казачная філасофія існасці ў знічках метафарычнага тэатра

«Казка», — першае, што прыйшло на розум. Падзея за падзеяй нагнятаецца трывога, перш чым здараецца вырашальная бітва, пераможцам якой абавязкова выйдзе галоўны герой, за якім, вядома, дабро… Але ж тут законы казкі парушаны: падаецца, што вырашальныя бітвы не ўвайшлі ў сцэнічную дзею, яны наперадзе для кожнага з герояў спектакля «Дарагая Памэла», якіх мы бачым толькі на пачатку шляху. Прэм'ерай паводле амерыканскага драматурга Джона Патрыка Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр абавязаны літоўскаму рэжысёру Альгірдасу Латэнасу.

Літоўскі тэатр — асобная з'ява, для апісання якой знайшлося вызначэнне, што замацавала адмысловы мастацкі погляд на рэчаіснасць. Мастацтва (любое і добрае) размаўляе метафарамі — гэтым і цікавае. Але ў драматычным тэатры, дзе ёсць акцёры, якія выконваюць ролі, а галоўны тэкст усё-такі прамаўляецца словамі, мова метафар часта застаецца фонам (нават неабавязковым). Менавіта яна стала вызначальнай рысай стылю літоўскіх рэжысёраў, у спектаклях якіх словы ўдакладняюцца, а сэнс становіцца больш важкім праз трапныя знаходкі, дэталі, дробязі, з якіх сплятаецца складаны карунак драматычнай дзеі. Літоўскі тэатр называюць метафарычным у першую чаргу дзякуючы Эймунтасу Някрошусу. Але побач з ім былі і працавалі (ды працягваюць гэта рабіць) калегі з такім жа адчуваннем тэатра. Спектаклі Альгірдаса Латэнаса, напрыклад, неаднойчы ўдзельнічалі ў міжнародных фестывалях, яго пастаноўка ёсць у расійскім Вахтангаўскім тэатры і іншых. А беларускія тэатралы памятаюць адчуванне фатальнасці лёсу, якое пакінуў «Макбет» у прачытанні Латэнаса ў Купалаўскім. Але даўно тое было. Цяпер новая гісторыя, спектакль зусім іншага настрою. Аднак тэма фатальнасці і лёсу, з якім нельга гуляць, гучыць зноў. Праз рэжысёрскія падыходы і прыёмы, уласцівыя метафарычнаму тэатру. І ўсё ж крыху інакш — дзякуючы драматургічнай аснове. Нездарма п'есу «Дарагая Памэла» ставілі пераважна як камедыю: трапныя жарты і нечаканыя павароты чапляюць гледача і цяпер, нягледзячы на тое, што прайшло больш чым паўстагоддзя з моманту яе напісання. Альгірдас Латэнас прачытаў гэтую гісторыю як драму. Праўда, не без бонусу для гледача ў выглядзе шчаслівага фіналу, на што настройвае пазнака «меладрама».

…Памэла вырашыла памерці. Сама прыняла такое рашэнне, каб за яе смерць нехта атрымаў страхавую выплату. Нехта — гэта нават не сваякі, не блізкія, не сябры. Звычайныя махляры, злодзеі — яна ведае, хто тыя людзі, да якіх так прывязалася. Але няхай у іх усё будзе добра. А тыя, пра каго яна так клапоціцца, увесь час балансуюць на мяжы спакусы: ці вартае ўвагі жыццё немаладой і абсалютна адзінокай жабрачкі, якая бадзяецца па звалках... Для кожнага з герояў, якія круцяцца вакол Памэлы, наступае момант выбару.

Каб больш выразна акцэнтаваць гэтыя моманты, рэжысёр выбраў нетаропкі тэмп апавядання, што абсалютна ў традыцыях літоўскага тэатра. Пры гэтым кожны эпізод павінен прайгравацца з паглыбленнем у матывацыю героя, калі ўсе рэплікі асэнсаваныя акцёрамі, каб іх паспяваў усвядоміць глядач — дзеля разумення невыпадковасці ўсяго, што адбываецца. Таму першая дзея здаецца доўгай (прычым усё ідзе па п'есе, без купюр, падрабязна), што можа збянтэжыць традыцыйнага гледача маладзёжнага тэатра, але разлік на тое, што яму захочацца даведацца, чым усё скончыцца. Такі падыход арыентаваны перш за ўсё на акцёрскую працу — каб перадаць характары і паказаць іх эвалюцыю. Прычым змены гэтыя мы паступова адчуваем нават знешне. Спачатку тройку «кампаньёнаў» бачым у пафасна-мудрагелістых строях — варыянт папсовага гламуру (мастак па касцюмах Вікторыя Ця-Сен). Незаўважна вобразы змяняюцца ў бок «вулічнай элегентнасці», як можна было б вызначыць стыль Памэлы, якую мы бачым у выкананні заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Наталлі Анішчанкі. Асоба ў нейкай ступені маргінальная, яна ўсё ж не зусім асацыяльны элемент: жанчына няшчасная, страціла мужа і дачку, апынулася на ўзбочыне жыцця, але ёсць нават знешні напамін пра тое, што калісьці яна была лэдзі, а цяпер проста даношвае старыя рэчы. Яна жыве ва ўласным доме, які цяпер знаходзіцца ў аварыйным стане, і вельмі сумуе па стасунках з іншымі людзьмі.

Дом — нібыта жывы персанаж. Мастак-пастаноўшчык Сяргей Бацула здолеў перадаць атмасферу гэтага незвычайнага месца, таму можна паверыць, што тут адбываюцца дзіўныя падзеі. Дом дыхае, радуецца: вельмі паэтычны момант, калі шкляначкі, падвешаныя да галінак і парасонаў, нібыта званочкі, вітаюць новых сяброў гаспадыні. А яшчэ ён рыпіць, калі злуецца, стогне ад адчаю і паглыбляецца ў змрок, калі прадчувае бяду. Зноўку імкнецца знайсці падставы для аптымізму — і абрынутая жырандоль абрастае ўтульнымі вазончыкамі. Пры тым, што дэкарацыі стацыянарныя, прастора падаецца пластычнай, рухомай.

У ёй атрымліваецца размежаваць этапы існавання герояў: у першай дзеі тройка злодзеяў не стрымлівае сваіх думак у амаль пустым пакоі — так, у пустым жыцці можна даваць волю самым розным думкам, не згадваючы пра маральныя абмежаванні. У другой дзеі запоўненасць сцэны сімвалічна падкрэслівае напоўненасць герояў любоўю, якую дорыць ім Памэла. Любоў ачышчае нават самыя злыя думкі і ўзвышае: вось Глорыя (актрыса Вольга Давыдава-Роік) у вясельнай сукенцы завісла пад самай столлю і нібыта анёл імкнецца прадухіліць чарговы віток злосных планаў. Але спускаецца на зямлю — і можа спакусіцца сама, калі знойдзена больш-менш лагічнае абгрунтаванне. Логіка супраць пачуццяў — і нават захоплены Сол Боза (артыст Сяргей Шаранговіч) пагаджаецца на прыгожы помнік для сваёй дарагой Памэлы. Існае супраць інфернальнага — у выніку для Брэда Вінера (Анатоль Лагуценкаў) наступае час, калі «плюс» і «мінус» мяняюцца месцамі. Найбольш паслядоўны і рашучы ў сваёй задуме, ён збянтэжаны злом, якое выйшла з-пад кантролю, — калі яго ўчыніў нехта іншы. Перад рэальнай бядой, якая ўваходзіць у хату, усе змоўшчыкі безабаронныя — і уздымаюць рукі ўгору, так ці інакш разумеючы сваю датычнасць да таго, што адбылося. Але тут яшчэ няма пакаяння (не так хутка яно адбываецца, як хацелася) — і мы праходзім яшчэ адно кола, Памэла павінна памерці неаднойчы, перш чым нешта канчаткова зразумеюць гэтыя людзі… Даходзіць да іх праз яе

самаахвярнасць, на якую здольная толькі чыстая любоў. І то не так проста да канца паверыць у пераўтварэнне «сяброў», асабліва ў выпадку з паліцэйскім (Іван Шчатко), які імгненна спакушаецца і так жа імгненна выбачаецца (ці не таму, што ён з Сіцыліі?) — яму наогул не надта верыш. Магчыма, гэтая рэзкая змена палюсоў у складзе мыслення і схіляе да думкі, што ў жыцці герояў будзе яшчэ не адна складаная сітуацыя, але гісторыя з Памэлай навучыць іх распазнаваць спакусы і супрацьстаяць ім. Што, як мы бачым, вельмі няпроста для чалавека. Людзі ідуць па жыцці спатыкаючыся, і далёка не ўсе ўмеюць пісаць лісты нябачнаму сябру, не ўсе ўмеюць прыкмячаць таемныя знакі і адчуваць нябачны, але напоўнены святлом свет, які для нас заключаны найперш у самой Памэле, якая ўмее лекаваць не толькі целы, але і душы. Таму адзіным рэальна шчырым яе спадарожнікам з'яўляецца жывёла — кот (артыст Юрый Шаланкоў выдатна ажыўляе лялечнага персанажа, які можа гуляць сам па сабе і з'яўляецца, калі патрэбны).

У такім вырашэнні, з такімі акцэнтамі спектакль глядзіцца як драма. І чаму гэтага трэба баяцца?

Асабліва калі ў драме — праўда. Чыста чалавечая. Яна адчувальная, нават не зважаючы на ўсе цуды, якія адбываюцца на сцэне: нібыта нешта ці нехта ўвесь час спыняе герояў (мо таму што рэальнае злачынства ўчыніць не так проста?). Праўда адчувальная і нягледзячы на перабольшванні, уласцівыя мастацкаму твору, асабліва калі ён утрымлівае рысы прыпавесці: Памэла размаўляе і чакае паслянняў аб Бога, якога іншыя пакуль не ведаюць. А вось наколькі выразна заззяе галоўная думка, дзеля якой героі сышліся ў гэтай гісторыі, залежыць не столькі ад метафар, атмасфернай мастацкай і чароўнай музычнай часткі. Кампазітар Фаўстас Латэнас надаў душы спектакля голас — вельмі выразны, а для некаторых сцэн наогул вызначальны, таму што задае іх рытм і характар, таксама становіцца дадатковай фарбай у тэмах герояў.

Але ў найбольшай ступені гэтая пастаноўка павінна трымацца на акцёрскім майстэрстве — кожная роля ўмяшчае сваю драму, якую трэба паказаць без мітусні і штучнага напружання. Задача няпростая, асабліва калі гледачы прызвычаіліся чакаць забаў, ды артысты ў прынцыпе гатовы пераключацца ў рэжым забаўляння. А тут іншае — праца на падсвядомасць, якая павінна потым працаваць нязмушана. Асабліва калі гаворка пра боскія справы — а гэта на пачатку XXI стагоддзя шмат для каго ўжо з'яўляецца прыгожай метафарай. Таму ёсць рэчы, пра якія трэба казаць напаўголасу — тады ў іх хочацца ўнікнуць. Тонкае палатно мы можам не адчуваць на скуры, калі на ім не выпіраюць асобныя вузельчыкі, інакш узнікаюць зусім іншыя рэакцыі. Артыстам патрэбны час, каб гэта ўсвядоміць і данесці, але з кожным паказам гэта атрымліваецца больш дакладна. І ў гледача не ўзнікае думкі, як дажыць да канца спектакля, які ідзе амаль тры гадзіны, а ён сапраўды перажывае фінал, які мяняе акцэнты, спакушаючы цудам, і фактычна пераводзіць аповед у казку.

Але ж у кожнай казцы — усяго доля казкі.

Валерыя АСІПЕНКА

VIVA ОПЕРА

Ганна Нятрэбка і Юсіф Эйвазаў з аншлагам выступілі на сцэне Вялікага тэатра

Зоркі сусветнай опернай сцэны Ганна Нятрэбка і Юсіф Эйвазаў выступілі ў Мінску. Гэта іх трэці прыезд у сталіцу Беларусі. У лютым 2018 года ў Палацы Рэспублікі ў суправаджэнні Нацыянальнага філарманічнага аркестра Расіі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Співакова яны далі канцэрт у рамках V Міжнароднага фестывалю «Уладзімір Співакоў запрашае». Затым прынялі ўдзел у адкрыцці II Еўрапейскіх гульняў.

І цяпер упершыню выступілі на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь у суправаджэнні аркестра тэатра. За дырыжорскім пультам — заслужаны артыст Азербайджана Фуад Ібрагімаў, запрошаны госць — вядомы італьянскі барытон Лука Сальсі.

25 кастрычніка ўпершыню адзначаўся Сусветны дзень оперы. Па ініцыятыве трох вядучых оперных арганізацый *Opera Europa, Opera America* і *Opera Latinoamerica* было вырашана пашырыць маштабы еўрапейскіх дзён оперы і заснаваць Сусветны дзень оперы. Яго мэта — прадэманстраваць уклад, які ўносіць опернае мастацтва ў развіццё культуры. Дата абраная невыпадкова: 25 кастрычніка нарадзіліся Жорж Бізэ і Іаган Штраус — аўтары самых вядомых опер і аперэт. Гэтую знамянальную падзею бліскуча адзначылі ў Мінску выступленнем самых запатрабаваных у наш час зорак опернай сцэны — Ганны Нятрэбка і Юсіфа Эйвазава.

Як звычайна бывае ў падобных канцэртах, сольныя вакальныя нумары, дуэты і трыа спалучаюцца з аркестравымі. І гэтым разам традыцыя была вытрымана. Але праграма, асабліва першага аддзялення, аказалася досыць няпростай. Як адзначыла сама Ганна Нятрэбка, артысты спецыяльна ўключылі ў яе складаныя творы, ведаючы, што ў зале будуць не толькі аматары опернага мастацтва, але і музыканты-прафесіяналы. У першым аддзяленні выконвалася толькі музыка Джузэпэ Вердзі: нумары з опер «Атэла», «Дон Карлас», «Луіза Мілер», «Рыгалета», «Сіла лёсу» і «Трубадур».

Першы выхад артыстаў публіка сустрэла бурнымі апладысментамі. Бліскуча быў выкананы дуэт з оперы «Атэла». Ганна Нятрэбка адзначае: «Тое, што мы спяваем разам, — выдатна, і нам вельмі пашанцавала, бо нашы галасы добра спалучаюцца, і тэатры рады бачыць нас».

Ганна — спявачка рэдкага таленту. Думаю, не варта шмат гаварыць пра ўнікальнасць яе голасу і выбудаванасць драматургіі ўсіх выкананых ёю оперных партый, пра знешнюю прыгажосць і велізарную сцэнічную абаяльнасць. Усё гэта добра вядома яе прыхільнікам. Кожны раз спявачка здзіўляе здольнасцю чапляць увагу публікі з першых гукаў кампазіцыі і ўтрымліваць яе да апошніх секунд. Ёй падуладна выкананне любых оперных партый: выдатна атрымліваюцца як насычаныя драматычныя эпізоды, так і далікатныя лірычныя. Спявачка паспяхова прадэманстравала ўсё гэта ў Арыі Леаноры з «Сілы лёсу», Арыі Лізаветы з «Дона Карласа».

У выкананні Юсіфам Эйвазавым Арыі Рудольфа з оперы «Луіза Мілер», а таксама Арыі і Кабалеты з оперы «Рыгалета» публіка змагла ацаніць тэмбральную прыгажосць голаса спевака, яго вакальную дасканаласць і высокі ўзровень акцёрскага майстэрства. Ён вольны ў выкананні тэхнічна складаных твораў і заўсёды стварае яркі вобраз свайго героя.

Беларускія оперныя меламаны змаглі пазнаёміцца з Лукой Сальсі — сусветна вядомым італьянскім оперным спеваком, які ўпершыню выступаў у Мінску. Выхаванец Пармскай кансерваторыі імкліва ўварваўся на падмосткі вядучых сусветных оперных тэатраў, сярод якіх Метраполітэн-опера, Ла Скала, Каралеўскі оперны тэатр у Лондане, Баварская дзяржаўная опера, Рымскі оперны тэатр і іншыя. Публіка захоплена адрэагавала на выкананне артыстам Арыі Макбета з оперы «Макбет», а таксама высока ацаніла яго ўдзел у ансамблях з Ганнай Нятрэбка і Юсіфам Эйвазавым, асабліва ў тэрцэце з оперы «Трубадур».

У другім аддзяленні канцэрта прагучала папулярная музыка. Вельмі драматычным быў Дуэт Дона Альвара і Дона Карласа з оперы Джузэпэ Вердзі «Сіла лёсу» ў выкананні Юсіфа Эйвазава і Лукі Сальсі. Выбухам апладысментаў сустрэла публіка Ганну Нятрэбка, якая выйшла на сцэну ў раскошнай белай сукенцы з залатымі кветкамі. Яна была, як і раней, непараўнальная ў Арыі Валі з оперы Анжалікі Каталані «Валі». Кантрастам прагучалі Арыя Каварадосі з оперы Джакома Пучыні «Тоска» і Арыя Лаўрэты з оперы гэтага ж кампазітара «Джані Скікі». Апошняй яркай кропкай у гэтым канцэрце стала выкананне ўрыўка з оперы «Андрэ Шэнье» Умбэрта Джардана.

Беларуская публіка высока ацаніла майстэрства не толькі спевакоў, але і таленавітага дырыжора Фуада Ібрагімава. Малады дырыжор, які атрымаў адукацыю ў Германіі, у Кёльнскай вышэйшай школе музыкі ў 2011 годзе, паспеў стаць дырыжорам Азербайджанскага сімфанічнага аркестра імя У. Гаджыбекава, а таксама галоўным дырыжорам Новага філарманічнага аркестра Мюнхена і Бакінскага камернага аркестра. Акрамя гэтага, ён — запрошаны дырыжор кёльнскага Гюрценіх-аркестра, галоўны дырыжор кёльнскага студэнцкага сімфанічнага аркестра *Simfonietta*.

Адчувалася, што дырыжор і музыканты аркестра Вялікага тэатра знайшлі поўнае паразуменне. Аркестр тонка акампаніраваў спевакам, якія адкрыта са сцэны дзякавалі дырыжору за такое ў найвышэйшай ступені прафесійнае зліццё. Стылістычна дакладна былі выкананы таксама аркестравыя нумары — уверцюра да оперы Джузэпэ Вердзі «Сіла лёсу» і вытанчанае інтэрмецца з оперы П'етра Масканьі «Сельскі гонар».

Бліскучы канцэрт скончыўся урыўкам з оперы Джузэпэ Вердзі «Травіята». Адчувалася, што зала ў захапленні: гледачы апладзіравалі, крычалі «Брава!». Асаблівую падзяку хочацца выказаць арганізатарам канцэрта холдынгу *Berin Iglesias ART* і яго прэзідэнту Максіму Берыну. *Berin Iglesias ART* — эксклюзіўны прадстаўнік Ганны Нятрэбка і Юсіфа Эйвазава ў Расіі, СНД і краінах Балтыі.

— У мяне канцэрты Ганны Нятрэбка і Юсіфа Эйвазава заўсёды выклікаюць асаблівае хваляванне, — адзначыў Максім Берын. — Мільённая армія прыхільнікаў ва ўсім свеце лічыць дні да магчымасці ўбачыць на адной сцэне двух найвялікшых оперных выканаўцаў нашага часу. І мне неверагодна прыемна ўсведамляць дачыненне да гэтай падзеі, якая мае ўсе падставы стаць знамянальнай у гісторыі опернай музыкі. Асаблівы гонар выклікае той факт, што канцэрт праходзіць на маёй радзіме на сцэне Вялікага тэатра Беларусі. Акрамя таго, што тут сабралася самая элітарная публіка, знаўцы высокага мастацтва, мы таксама з вялікім задавальненнем запрасілі на канцэрт студэнтаў музычных навучальных устаноў Мінска. Сярод запрошаных — лаўрэаты музычных конкурсаў, медалісты, уладальнікі дыпломаў і ганаровых узнагарод.

Элеанора СКУРАТАВА

на развітанне

З мелодыямі назаўжды

Незабыўныя фрагменты жыцця кампазітара Алега Молчана

Асоба беларускага кампазітара-песенніка Алега Молчана знакавая для нашай краіны. Менавіта яго песні сёння ўспрымаюцца як культурныя сімвалы, якія назаўжды ўвайшлі ў гісторыю Беларусі. 26 кастрычніка Алега Уладзіміравіча не стала. Пасля працяглай хваробы кампазітар памёр у Швейцарыі.

Алег Молчан нарадзіўся ў Мінску ў сям'і прафесійнага музыканта. Яго кампазітарскі дэбют адбыўся ў 8 гадоў, калі ён вучыўся ў сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Адразу пасля заканчэння школы пачаў працаваць як піяніст у мінскіх музычных калектывах.



Кампазітар адзначыўся ў самых розных жанрах: ад эстраднай песні і джаза да акадэмічнай і харавой музыкі, быў віртуозным джазавым піяністам і таленавітым аранжыроўшчыкам. Шырокую вядомасць ён атрымаў як аўтар мноства кампазіцый, якія выконваліся Уладзімірам Мулявіным і «Песнярамі»: ад «Маргарыты» на вершы Анатоля Лягчылава да знакамітай «Малітвы», якая была напісана на кампіляцыю строф з двух вершаў-малітваў Янкі Купалы. Іх прынёс Алегу Молчану сам Мулявін. Хацеў, каб малады аўтар пасля паспяховых «Кумы» і «Падманіце мяне» напісаў для яго баладу. У легендарным ансамблі Алег Уладзіміравіч працаваў дзевяць насычаных гадоў, дзеля яго калісьці Уладзімір Мулявін увёў пасаду музычнага кіраўніка калектыву.

Як аранжыроўшчык Алег Уладзіміравіч працаваў над праграмамі «Вянок» паводле твораў Максіма Багдановіча, якую «Песняры» выконвалі ў Бібліятэцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Ёрку, «Голас душы» і «Казацкая вольніца». Менавіта ён аўтар вядомых нам версій «Лявоніхі», «Чырвонай ружы» і многіх іншых хітоў «Песняроў» 1990-х. Па сутнасці, аўтарскае бачанне Алега Молчана і яго імкненне спалучаць традыцыі ансамбля з сучаснымі тэндэнцыямі і вызначалі асноўны сэнс работы калектыву. Пасля расколу «Песняроў» у 1998 годзе менавіта Молчан дапамагаў Мулявіну збіраць новы склад ансамблю.

Пасля «Песняроў» Алег Молчан нямала пісаў для зорак беларускай сцэны, працаваў з многімі як прадзюсар: яго кампазіцыі з задавальненнем бралі ў свой рэпертуар Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, Якаў Навуменка, Мікалай Скорыкаў і іншыя. Некалькі альбомаў з яго песнямі запісала жонка — спявачка Ірына Відава. Таксама кампазітар актыўна займаўся дзейнасцю ў сферы аўтарскага права ў Беларусі і не толькі. Так, у 2018 годзе яго абралі прэзідэнтам Еўразійскай канфедэрацыі таварыстваў праваўладальнікаў.

Са страшнай хваробай Алег Уладзіміравіч змагаўся дзесяць гадоў. Тым не менш гэты час ён пражыў ярка і прыгожа. Працягваў ствараць цудоўныя песні, абсталяваў дома студыю па апошнім слове тэхнікі. Менавіта ў гэты перыяд былі створаны знакамітыя кампазіцыі «Родныя песні», «Дзве таполі», «Песня мая» на вершы Янкі Купалы, «Карабель маёй краіны», «Аксамітны сезон» на вершы Алеся Ліпая, «Каханне сказала так», «*Liebe Love L'amour*», «Думала», «Прыгажуня закахаецца», «Беларусь» на словы Ірыны Відавай.

Адным з найважнейшых праектаў Алега Молчана ў апошнія месяцы было выданне на маскоўскай фірме «Мелодыя» альбома да 50-годдзя «Песняроў» — гэта песні кампазітара ў выкананні як ансамбля, так і асобных яго салістаў у розны час. Улетку Молчан чакаў, што хутка пойдуць у вытворчасць калекцыйны вініл і двайны CD-рэліз, у якіх будуць розныя варыянты яго хітоў: адну толькі песню «Юнацтва» першапачаткова спяваў у ансамблі Ігар Пеня, потым да яе звярталіся Уладзімір Мулявін, Анатоль Кашапараў, Вадзім Касенка.

У наступным годзе Алег Уладзіміравіч планаваў правесці свой юбілейны канцэрт — 11 красавіка яму споўнілася б 55 гадоў. Цяпер гэта будзе канцэрт памяці кампазітара.

Вікторыя АСКЕРА

Скарбонка Спадчыны

«Святыя дзяды, завём вас!»

Восеньскі Дзень памяці як падзяка за добры ўраджай

У беларускім народным календары нямала святаў, так ці інакш звязаных з культам продкаў. Увесну, на Радуніцу, прынята наведваць могілкі, наводзіць там парадак, частаваць памерлых, каб заручыцца іх падтрымкай і спрыяннем у пачатку земляробчага сезона. Лічылася, што памерлыя могуць абараніць новы ўраджай і свойскую жывёлу. А ўвосень, на Дзяды, якія адзначаюць ужо пасля Багача, клікалі душы продкаў у госці, каб падзяліцца набыткамі, паказаць, што ў хаце і ў сям'і парадак, лад і згода.

На святочную восеньскую вячэру дзядоў запрашаюць у розныя дні. Усё залежыць ад завядзёнак, прынятых у пэўнай мясцовасці, а таксама канфесійнай прыналежнасці. Так, каталікі зазвычай згадваюць продкаў у дзень усіх святых, праваслаўныя адлічваюць час ад Пакроваў, існуе ў Беларусі і агульны Дзень памяці, 2 лістапада.

Да святкавання восеньскіх Дзядоў варта было рыхтавацца загадзя. Мужчыны наводзілі парадак у двары і ў хляве, гумне, прыводзілі да ладу сельскагаспадарчыя прылады, якія спатрэбяцца толькі наступнай вясной. Жанчыны старанна прыбіралі ў хаце, выціралі пыл з ікон, аздаблялі іх чыстымі ручнікамі. Рабілі гэта, каб душам продкаў, якія завітаюць на вячэру, нічога не перашкаджала, каб паказаць ім, што ў гаспадарцы і ў хаце заўсёды падтрымліваецца парадак, а набыткі, якія перайшлі ў спадчыну ад бацькоў і дзядоў, не занядбаныя. Лічылася, што менавіта чысціня ва ўсіх яе праявах садзейнічае прыходу душ продкаў. Таму перад вячэрай усе абавязкова мыліся ў лазні, адзявалі свежыя кашулі, сукенкі. Дарэчы, у некаторых рэгіёнах прынята пакідаць у лазні на ноч вядро чыстай вады і новы венік — каб і дзяды маглі памыцца.

У пачатку вячэры варта было запаліць свечку і паклікаць продкаў. Зазвычай гэта рабіў гаспадар хаты. Ён уставаў і казаў: «Святыя дзяды, завём вас, хадзіце да нас! Тут усё, што Бог даў». Потым маліліся «Ойча наш» і пачыналі есці. У гэты вечар за сталом гутарылі выключна пра памерлых і размаўлялі выключна пра станоўчыя іх рысы. Распавядалі гісторыі з жыцця, называлі імёны продкаў, дзяліліся ўспамінамі.

Існавалі і пэўныя правілы паводзінаў падчас вячэры. Так, нельга было ставіць ногі на ніжнія жэрдкі стала. У гэты час там, як птушкі на галінках, адпачываюць душы продкаў, а неасцярожным рухам ног можна іх пакрыўдзіць, а дзяды за гэта могуць адпомсціць хваробамі суставаў. Калі на святло залятаў матылёк, ён лічыўся божым пасланцам, а ўсялякія нечаканыя гукі — шум лісця на дрэвах, звон шкла ў вокнах, шоргаты і скрыпы ўспрымалі як знак нябачнай прысутнасці продкаў.

На стале абавязкова павінны былі прысутнічаць куцця і бліны. У некаторых рэгіёнах падчас святочнай вячэры не елі хлеб, яго замянялі блінамі. Частаваліся поліўкай, малаком, яечняй, кашай. Гатавалі любімыя стравы продкаў. Паколькі ў гэты вечар згадвалі продкаў аж да сёмага калена, то страў павінна быць сем. Кожная з іх падавалася на дзвюх талерках, каб ні жывыя, ні памерлыя не былі пакрыўджаныя. А ў XIX ст. з'явіўся новы звычай: на край стала, які бліжэй да покуці, ставілі асобную талерку з кавалачкамі ўсіх страў, віном і кавалачкам хлеба для дзядоў. Дзядам ахвяравалі і трэць першай чаркі гарэлкі ці віна.

У пэўных рэгіёнах Дзяды святкавалі не адзін дзень і ў кожны з іх варта было выконваць пэўныя правілы. Так, этнаграфічныя крыніцы сведчаць, што ў Слонімскім павеце свята мела такі парадак: «абавязковымі стравамі лічацца: у пятніцу — квас, сялёдка, гарох і грачаная каша, а ў суботу ў многіх пякуць "пірагі" (той жа хлеб, толькі прэсны, і булкі качаюць у муку), куцця — гарох з макам ці сухі, бліны грачаныя, квас ці капуста, мясныя стравы — большай часткай свініна, аднак у многіх на розныя выпадкі прынята мець ялавічыну, бараніну і курацiну, пасля мяснога падаюць макароны, грачаную кашу і яечню... Жыве перакананне, што калі толькі не прыгатаваць да Дзядоў тое, што ўжо раз кімсьці ў доме заведзена, то па гэтай частцы ў гаспадарцы таго дома будзе нястача. Так, калі няма ялавічыны, бараніны, курацiны і г. д., то ў тым доме прападзе што-небудзь з рагатай жывёлы, авечак, курэй».

Ёсць яшчэ адно правіла святкавання Дзядоў: нельга нічога прыбіраць са стала да наступнага дня, бо продкі могуць завітаць і ўночы. Заканчвалася вячэра таксама агульнай малітвай. Гаспадар тушыў свечку кавалачкам хлеба, сачылі за тым, у які бок пойдзе дым. Калі ён ішоў у бок дзвярэй — значыць, цягам года ў сям'і нехта памрэ. Пасля гэтага гаспадар зноў звяртаўся да душ продкаў: «Святыя дзяды, вы сюды прыляцелі, пілі, елі, ляціце ж цяпер да сябе! Скажыце, чаго яшчэ трэба? А лепей ляціце на неба! Акыш, Акыш...»

Каб духі не вярнуліся ў свет жывых, часам у хаце ставілі барану, пры гэтым вострыя канцы скіроўвалі ў бок парога.

Марына ВЕСЯЛУХА, фота аўтара.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснік галоўнага рэдактара — 377-99-72
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 377-99-72
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
31.10.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 952

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 3774

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.